ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №6 (82)
(чэрвень)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

ПАМЯЦЬ

«ЕВАНГЕЛЛЕ АД БЫКАВА»

Дзесяць гадоў таму — 22 чэрвеня — спачыў у вечнасці Васіль Быкаў, сумленне і гонар Беларусі. З таго дня сплыло шмат вады ў рацэ Лета, але галоўныя пытанні, якія непакоілі Васіля Быкава — грамадзяніна і творцу — засталіся нязменнымі.

Увесь чэрвень у эфіры «Радыё Свабода» сябры, чытачы, даследчыкі творчасці Васіля Быкава разважалі пра тое, што са спадчыны народнага пісьменніка найбольш важнае сёння. «ЛБ» падае ніжэй некаторыя з тых прызнанняў. А на старонках 8–9 дадатка змяшчае паэму «Празорца», прысвечаную Васілю Уладзіміравічу…

Генадзь Бураўкін:

«Для мяне Васіль Быкаў паранейшаму жывы. Ён часта прыходзіць да мяне, хоць і ў сне, засяроджаны і ўсмешлівы, маўклівы і самотны. Я і сёння раз-пораз азіраюся на яго ў нашым сумятлівым і жорсткім жыцці, і з часам ён не аддаляецца, а наадварот, набліжаецца да мяне, пазбаўляючыся выпадковай бытавой драбязы і ўсё больш набываючы мудрасці і мужнасці, відавочна робячыся ўзорам і настаўнікам.

Што ж галоўнае бачыцца мне ў жыцці і творчасці Быкава? Перш за ўсё — ягоны яркі талент і самаахвярнае служэнне праўдзе. Менавіта гэтыя яго якасці вымушалі ў савецкі час самых высокіх чыноўнікаў аддаваць яму, нязручнаму і не любімаму, афіцыйныя знакі дзяржаўнай увагі. Менавіта яны ў нашы дні прымушаюць яшчэ больш прымітыўных і нахабных палітычных дзялкоў мірыцца з тым, што выходзяць, хай і зусім не часта, ягоныя кнігі, здымаюцца, хай і не ў Мінску, мастацкія фільмы па ягоных аповесцях…

І яшчэ адну істотную рысу характару і паводзінаў Васіля Быкава хачу абавязкова адзначыць: надзвычайную чалавечую годнасць. Ён падкрэслена спакойна і цярпліва прымаў і незаслужаную аглабельную крытыку сваіх твораў, і бляск шчодрых узнагарод, якімі крамлёўскія кіраўнікі ў апошнія гады свайго валадарання нібы спрабавалі адкупіцца перад ім за шматгадовую несправядлівасць і адкрыты пераслед. Ох, як не хапае быкаўскай годнасці многім сённяшнім літаратарам і палітыкам!

І ўжо зусім асабістае. Васіль быў рэдкім па шчырасці і вернасці сябрам. І ў хвіліны радасці, і ў хвіліны адчаю ён ніколі не забываў патэлефанаваць ці напісаць, і спагада і дабрыня ягоныя былі такімі натуральнымі і простымі, што самі сабою супакойвалі душу…

Так што Васіль Быкаў для мяне — жывы, неабходны, абавязковы і для гісторыі роднай Беларусі, і для яе цяперашняга часу, і для будучыні. І трэба часцей успамінаць яго, азірацца на яго, вучыцца ў яго».

Сяргей Законнікаў:

«Васіль Быкаў падкрэсліваў, што лёс кожнай кнігі залежыць ад таго, колькі ў ёй закладзена ад праўды народнага жыцця. Яго творчасць мае выразна беларускія нацыянальныя карані, аблічча, душу, і разам з тым сваёй духоўнай напоўненасцю, маральным максімалізмам і актыўным гуманізмам яна ўліваецца ў плынь агульначалавечай літаратуры і культуры…

Уплыў творчасці Васіля Уладзіміравіча на сучасную літаратуру значны. Галоўным застаюцца ключавыя словы, якія вельмі былі важныя для Васіля Уладзіміравіча, — гэта праўда, ісціна і выбар. Гэта і ёсць знакавыя, галоўныя, ключавыя словы для таго, каб адкрыць творчасць Быкава і зразумець яго як чалавека і як пісьменніка.

Якраз у гады таталітарызму, пра які мы сёння забываем, з аднаго боку, а з другога — упадаем у яго новую эру, і, я б сказаў, эру цынізму і хлусні, Быкаў паказаў праблемы, з якіх складаецца цэлая эпоха...

Для мяне ён са сваёй такой сумнай усмешкай застаецца ідэалам чалавека, які добра ведае цану жыцця і смерці і таму адстойвае гэтае жыццё з усімі яго бедамі, слязьмі, радасцю».

Данута Бічэль:

«Чытаць Быкава было цяжка, але гэта было дзякуючы ягонаму магічнаму стылю. Ён зацягваў чытача сваім залішне спакойным апавяданнем, нагляданнем збоку, што нельга было адарвацца ад тэкста. Прыходзіла нешта новае, створанае ім, і прыходзіў канец нармальнаму жыццю — ні есці, ні піць, ні працаваць, пакуль не прачытаеш. І потым ходзіш у нейкім чадзе, пакуль не вылезеш з гэтага. Сам аўтар як бы заставаўся непрысутным. Было толькі тое, што ён прыпаднёс. А прыпадносіў тое, што сам пражыў, перабачыў, абдумаў, акуратна запакаваў у аб'ём не вялікі і не малы…

Я думаю, што ў быкаўскім палоне пэўны адрэзак часу пабывала нямала людзей. Нейкім чынам ён выхоўваў народ, фармаваў людскія роты і батальёны.

Ён быў у канкрэтным сваім часе, але быў як бы па-за часам, быў па-за нацыяй, але ён быў беларускім…

І, канечне, ён наперадзе. Ён — першы. І хай ён будзе».



Фота з архіва В. Быкава

Духоўнае ўздзеянне быкаўскіх твораў сёння перакрочвае межы літаратуры і набліжаецца да іншых сфераў духоўнага жыцця: кіно, псіхатэрапіі, рэлігіі…

Уладзімір Някляеў:

«У спадчыне Васіля Быкава няма, бадай, нічога, што сёння не было б важным для нас, але найбольш важнае ў ёй — сам Васіль Быкаў. Важная не толькі мастацкая моц ягоных твораў, але і ягоная асабістая, чалавечая вартасць. Важная быкаўская беларускасць, якая складаецца з мужнасці, прынцыповасці, непахіснасці, што ўсё разам складае характар, які ні ў чым не супадае з тым вобразам рахманага «бульбаша», якім малюе беларуса сённяшняя антыбеларуская ўлада, бо менавіта гэтакі беларус патрэбны ёй: на рахманых ваду возяць.

У цяперашній цынічнай, хамскай, пазбаўленай маралі рэчаіснасці найважныя тыя быкаўскія творы, у якіх паўстае праблема маральнага выбару, а гэта зноў жа — амаль увесь Быкаў. Гэта і ягоны Сотнікаў з аднайменнай аповесці, і Сушчэня з аповесці «У тумане», які па сумленні жыць болей не мог, а без сумлення — не захацеў. І калі нязломны Сотнікаў у нечым літаратурны, прыдуманы, дык «рахманы» Сушчэня — характар цалкам рэальны. Такі, які ён ёсць у беларуса. Да ўсяго, Сотнікава знішчаюць ворагі, а Сушчэню — праз правакацыю ворагаў — свае. Знішчэнне беларусамі беларусаў, знішчэнне саміх сябе — гэта хіба не найважнае для нас? Гэта хіба не тое, што робіцца й сёння?..

Няхай нясцерпная, але праўда — гэта ўрэшце і ёсьць тое, што было самым важным для Быкава і застаецца самым важным для нас».

Юрась Залоска:

«У нашай культуры сёння запатрабавана самае істотнае, што ёсць у мастацкім свеце Васіля Быкава, тое, на чым гэты свет заснаваны, — гэта метафізіка і псіхалогія чалавечага выбару. Драма выбару, ад якога няма куды ўцячы. Тут Быкаў выступае як пісьменнік-чалавеказнаўца, мастак і псіхолаг гэтай драмы, якой ёсць выбар — выбар маральны, каштоўнасны, чалавечы. Выбар, які звязаны з ахвярай.

Праблематыка выбару і ахвяры яскрава відаць ужо ў першай вядомай нам са школы аповесці Быкава «Жураўліны крык». Далей яна атрымлівае распрацоўку ў працяглай сціжме твораў: «Мёртвым не баліць», «Трэцяя ракета», «Круглянскі мост», «Сотнікаў», «Дажыць да світання», «Пайсці і не вярнуцца» і іншых… Істотнае і важнае сёння быкаўскае гуманістычнае пасланне беларусам, усім чытачам яго твораў.

Духоўнае ўздзеянне быкаўскіх твораў сёння перакрочвае межы літаратуры і набліжаецца да іншых сфераў духоўнага жыцця: кіно, псіхатэрапіі, рэлігіі...

Гаючая функцыя быкаўскага радка можа быць выкарыстана як духоўны рэсурс нашымі прапаведнікамі. Напрыклад, я асабіста ў гэтым годзе ў Вялікі Пост пабудаваў два казанні ў праваслаўнай царкве на творах Быкава. Першае — на сюжэце рамана «Кар'ер», дзе істотны матыў пакаяння галоўнага героя; другое — на матэрыяле апавядання «Круты бераг ракі», дзе істотны матыў святога чакання і надзеі на сустрэчу.

Згаданая аповесць «Сотнікаў», на маё ўспрыманне, — гэта ўвогуле Евангелле ад Быкава, Евангелле разгорнутае, бо тут ёсць не проста Юда-Рыбак, але Юда, паказаны знутры, вось што важна. І паказана непазбежнасць пятлі для Юды».

ПАЛІЦА

«КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА»

Леанід Маракоў. Непамяркоўныя



Непрыдуманыя, амаль дакументальныя, а шмат у чым і аўтабіяграфічныя апавяданні па часе ахопліваюць ледзь не ўсё ХХ стагоддзе. Напісаны яны свежым, лёгкачытэльным стылем і ў сваёй аснове маюць вострыя, дынамічныя сюжэты. Сюжэты нібы прыдуманыя самой гісторыяй, самім жыццём. Жыццём-палётам над безданню...

Святлана Раманава. Смарагдавы рай

Прысвечаная самым блізкім людзям (матулі і дочкам) кніга з'яўляецца спавядальна-справаздачнай і раскрывае перад намі тонкі сусвет духоўнай прасторы аўтара, раскрывае суплёт думак і памкненняў, скіраваных да адвечных пытанняў: самаўдасканалення, спасціжэння свету, пошуку свайго месца ў ім.

Кніга мае шэраг раздзелаў: «На ўлонні вясны», «Верлібры з пэндзлем у руцэ», «Мацярынскае слова», «Гаркавы водар хрызантэм». Цікавымі і адметнымі падаюцца ўкладзеныя ў кнігу вершы-прысвячэнні.

Барыс Пятровіч. Спакушэнне



У выдавецтве «Кнігазбор» пабачыла свет кніга Барыса Пятровіча «Спакушэнне», куды ўвайшлі выбраныя апавяданні, публікаваныя раней у зборніках «Ловы», «Сон між пачвар», «Фрэскі», «Шчасьце БЫЦЬ…», а таксама шэсць зусім новых твораў.

Апавяданні, прадстаўленыя ў кнізе, дэманструюць розныя манеры аўтарскага пісьма: ад класічнага паслядоўнага разгортвання падзей да пошукаў у стылістыцы і разнявоенасці ў сінтаксісе. Уменне аўтара на некалькіх старонках адлюстраваць цэлае жыццё чалавека — адзнака сапраўднага майстэрства. Героі кнігі «Спакушэнне» балансуюць на мяжы розных пачуццяў: явы і сну, хаосу і гармоніі, на мяжы мінулага і будучыні, і ў гэтым якраз заключаная спакуснасць жыцця.

Таня Скарынкіна. Всё истинная правда…



Таня Скарынкіна — прадстаўніца расійскамоўнай паэзіі Беларусі, жыве ў Партугаліі. Родам са Смаргоні, у розны час працавала паштальёнам, ілюстратарам дзіцячых кніг, журналістам. Спрабавала сябе ў мастацкім перакладзе. Цяпер акрамя літаратуры займаецца фотакалажамі — ствárae мастацкія кампазіцыі з розных на першы погляд непатрэбных рэчаў і жывёл. Прыкладам, фатаграфуе мёртвых птушак.

Паэзія для Тані — «генератар касмічных галасоў». Яе прывабнасць — у вялікай свабодзе фантазіі і самавыяўлення, у тонкіх гульнях розуму, у пошуках сябе…

Валерый Дубоўскі. На пачатку маўчання

Новым выданнем у бібліятэцы Саюза беларускіх пісьменнікаў стаў томік вершаў Валерыя Дубоўскага «На пачатку маўчання».

Спадар Дубоўскі раней вядомы беларускай грамадзе як журналіст, кіраўнік шэрагу беларускіх перыядычных выданняў, дырэктар выдавецтва «Беларусь», цяпер выступіў у новай для сябе ролі — аўтара кнігі паэзіі. Менавіта кнігі, а не зборніка паэзіі, што падкрэслівае ў прадмове да яе мэтр айчыннай літаратуры Рыгор Барадулін: «Гэта кніга паэзіі: мяноўна кніга, а не зборнік. Бо ёсць развіццё вобразаў, задум, гутаркі і спрэчкі з часам. Валер Дубоўскі не піша вершы, рыфмаваныя радкі ці верлібры. Ён жыве паэзіяй. Думае, як падказвае паэзія…».

ЛІПЕНЬСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:



23.07.1963 — Алесь Іванавіч Бельскі
27.07.1933 — Навум Якаўлевіч Гублер

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

САЮЗ

ШКОЛА МАЛАДОГА ЛІТАРАТАРА: «ПАРАХОДЗІК СУЧАСНАСЦІ»

На «Параходзіку сучаснасці» пажадана было з'явіцца ў сінім або паласатым, прачытаць свае творы публіцы, уклаўшыся ў тры хвіліны, і выцягнуць «білет» з імем наступнага выступоўцы.



Такой была завяршальная вечарына сёлетняга курса Школы маладога літаратара, якая дзейнічае пры ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў». Сярод выпускнікоў — паэты, празаікі, перакладчыкі. Куратарамі Школы былі Уладзімір Някляеў, Валянцін Акудовіч, Андрэй Хадановіч і Алесь Пашкевіч. Ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося ўручэнне 20 сертыфікатаў.

Адна з каардынатараў Школы, вядучая вечарыны Юля Цімафеева павітала ўсіх прысутных і перадала слова празаіку, старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, галоўнаму рэдактару часопіса «Дзеяслоў» Барысу Пятровічу.

— Летась па выніках літаратурнага конкурсу «Экслібрыс» са ста ўдзельнікаў было выбрана 35 фіналістаў, у Школу маладога пісьменніка патрапілі 22 творцы. Цягам васьмі месяцаў мы спрабавалі разбурыць стэрэатып адносна таго, што навучыць пісаць немагчыма. У наступным годзе ёсць планы працягнуць Школу, але паколькі вучыліся не толькі вы, але і мы таксама, то будзе іншы, удасканалены фармат заняткаў, — адзначыў спадар Барыс у сваім звароце да выпускнікоў.

У сваіх выступах Павел Капанскі, Ганна Міхальчук, Наста Грышчук не толькі чыталі ўласныя творы, але і дзяліліся ўражаннямі ад Школы і распавядалі пра тое, што яны набылі дзякуючы сваім выкладчыкам і калегам.

Уладзімір Някляеў, куратар групы паэтаў, у віншавальным слове заўважыў:

— За Саветамі ў Саюз пісьменнікаў, як і ў Літінстытут, было немагчыма патрапіць, бо гэта было прэстыжна і прыносіла матэрыяльныя выгоды: кнігі, кватэры, машыны. А цяпер піша толькі той, хто не можа не пісаць. Таму сярод маіх семінарыстаў няма выпадковых людзей. А пра «параходзік сучаснасці» — тое праўда яшчэ з часоў Уладзіміра Маякоўскага.

Надзвычай яркімі і запамінальнымі былі чытанні Юлі Цімафеевай з лірычным эратычным вершам і Анкі Упалы з апавяданнем пра Купалу, Коласа і Караткевіча.

Выступілі Воля Чайкоўская, Кірыл Дубоўскі, Дар'я Латышава, Андрэй Касцюкевіч. Усіх выпускнікоў вельмі цёпла сустракалі гледачы — імпрэзу наведалі не меней за сорак чалавек.

Філосаф і літаратар Валянцін Акудовіч, які курыраваў маладых празаікаў, прызнаўся: «Мне з вамі было вельмі ўтульна. Я не куратарам быў, а мадэратарам — варта было проста падказваць кірунак ужо цалкам самастойным, складзеным творцам».

Адно за адным на сцэну выходзілі Дар'я Вашкевіч, Марына Варабей, Марыя Лапо, Наталля Ярмольчык, Андрэй Вылінскі, каб агучыць свае творы і атрымаць сертыфікаты. Павал Анціпаў зачытаў урывак са свайго новага рамана.

Віка Трэнас расказала пра сёлетні конкурс «Экслібрыс» імя Янкі Маўра, удзел у якім да 1 жніўня могуць прыняць аўтары да 40 гадоў, якія пішуць або малююць для дзяцей.

Прэс-сакратар СБП, а таксама партнёр конкурсу, прадстаўнік маркі Prestigio у Беларусі, прадэманстравалі галоўны прыз, які атрымае пераможца гэтай восенню — новую мадэль планшэта Prestigio MultiPad 8.0 3G Note, створаную адмыслова для журналістаў, пісьменнікаў і ўсіх тых, чыя праца звязаная са словам. Дарэчы, сайт ebooks.prestigioplaza.com — адначасна электронная бібліятэка і інтэрнэт-крама, дзе ёсць кнігі сучасных беларускіх аўтараў. Некаторыя з гэтых электронных выданняў ёсць у вольным доступе, некаторыя можна спампаваць платна.

Алесь Пашкевіч, першы намеснік старшыні ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў», згадаў пра праведзеныя заняткі, на якіх разбіраліся творы класікаў беларускай літаратуры, падзякаваў наведнікам Школы за супрацу і пажадаў ім творчай свабоды.

Завяршылася вечарына чытаннямі Антона Рудака, Рамана Абрамчука, Кірыла Стасελькі, Ані Рудак, Яны Бандарчык.

РАДА

На чарговым пасяджэнні Рады ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» з дакладамі аб дзейнасці выступілі старшыні абласных аддзяленняў і былі прынятыя ў арганізацыю восем новых сяброў: выдавец, паэт і журналіст Валеры Дубоўскі, публіцыст і аўтар журналісцкіх даследаванняў Валерый Каліноўскі, журналістка, аўтарка вершаў і прозы Дар'я Ліс, краязнавец і журналіст Сяргей Макарэвіч, паэтэса Святлана Раманава, літаратуразнаўца, перакладчыца і паэтэса Наталля Русецкая, празаікі Наталка Харытанюк і Аляксей Чубат.


Фота Алены Казловай

Даклады пра дзейнасць абласных аддзяленняў СБП былі агучаныя прадстаўнікамі з Брэста (Іван Мельнічук), Магілёва (Мікола Яцкоў), Гродна (Юрый Голуб), Гомеля (Анатоль Бароўскі). Расповеды датычыліся выдання рэгіянальных альманахаў і інфармацыйных бюлетэняў, супрацоўніцтва са школамі і ўніверсітэтамі, працы з моладдзю. Старшыня Рады ГА «СБП» Барыс Пятровіч акрэсліў пытанні па Віцебскім абласным аддзяленні, якое аднаўляе сваю дзейнасць.

Пасяджэнне Рады завяршылася абмеркаваннем бягучых пытанняў грамадскай арганізацыі.

Прэс-служба ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

МАГІЛЁЎ

На пасяджэнні Магілёўскага аддзялення ГА «СБП» Мікола Яцкоў зрабіў справаздачу аб дзейнасці пісьменніцкай суполкі.

Былі адзначаны запрашэнне сяброў аддзялення да ўдзелу ў абласным святе паэзіі «Пісьмянкоў луг» у Касцюковічах і выхад у свет зборніка паэзіі «Свято «Святліцы»» магілёўскага гарадскага літаратурнага клуба «Святліца» пад кіраўніцтвам сябра СБП Тамары Аўсяннікавай.


Літаратары былі таксама праінфармаваны аб выніках пасяджэння Рады СБП, на якой кіраўнікі абласных аддзяленняў рабілі справаздачы.

Праведзена абмеркаванне плану дзейнасці рэдакцыйнай калегіі маючага быць літаратурнага альманаха. Былі прапанаваны тры варыянты назвы альманаха: «Прытокі», «Кола» і «Строма». Рабочай назвай альманаха вызначана «Строма».

ЮБІЛЕЙ

БЫЦЬ МОЖА, ЁН СЯРОД НАС?

МІКОЛУ ФЕДЗЮКОВІЧУ — 70



Янусь МАЛЕЦ

Ён нарадзіўся 22 мая 1943 года, калі над краінай яшчэ палыхала полымя вайны. У жыццё «ўзляцеў» з вёскі Гутава (Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці) з беднай сялянскай сям'і, як птах з апаленымі крыламі. Душэўныя раны не зажывалі на працягу ўсяго пакручастага шляху. У яго першым зборніку «Зямля — магніт» гэта прагучала пранізліва ў вершы «Балада пра буслоў»:

Ад пажару
аблокі,
як сцены,
крышыліся.
Я стаяў нерухома
на чорным дзядзінцы…
Прыляталі буслы —
і бяссільна кружыліся
над маім трохгадовым,
пякельным дзяцінствам.
……….
Бацька мёртвы…
Трываць немагчыма…
І раней,
і пасля,
колькі помню я выраў,
вырай той —
самы жудасны вырай…

Адкуль асобным людзям даецца паэтычны талент — загадка? Кажуць, ад Бога. Напэўна, так. Але навошта? З гэтым жа дарам жыць няпроста. Часам пакутліва да невыноснасці. Вядома, калі ты сапраўдны паэт. Хаця… зрэдчасу здараецца і эйфарычны палёт душэўных пачуццяў. Тады сняцца прыгожыя каляровыя сны, у якіх творцы лятаюць над пяшчотнай зямлёй і фантазія нараджае неверагодныя мары.

Так буду жыць.
Ні славы,
ні праклёнаў.
Да скону верны жонцы
і пяру,
Да скону у Радзіму улюблёны.
Быць можа,
я ніколі не памру.

Наіўнасць? Лёгкаважкі пафас? Ды не! Наконт бясконцага жыцця магчыма і занадта смелы вобраз, а ва ўсім астатнім — ён, Мікола Федзюковіч, сціплы чалавек і творца, мэтанакіраваны, руплівы шукальнік надзейнага і справядлівага ў жыцці.

Мікалай Мікалаевіч быў вельмі адказным на працы. І не таму, што баяўся начальства, а таму, што меў такі — паляшуцкі — характар і склад душы. Абы-як да сваіх абавязкаў адносіцца проста не мог, бо не дазваляла сумленнасць. Не сумняваюся, не ў мяне аднаго ў архівах назбіралася шмат ягоных паведамленняў пра пасяджэнні літаратурных аб'яднанняў з прапановамі дасылаць новыя творы ў рэдакцыі і на радыё, з паведамленнямі пра ўдзел вядомых літаратараў. Часам на рэдакцыйных бланках «Звязды», «Чырвонай змены» і іншых выданняў, дзе працаваў, ён пісаў пісьмы-карацелькі, у якіх цікавіўся ветліва жыццём і творчасцю, даваў парады, рабіў заўвагі. Ведаю добра, колькі асабістага часу ён аддаваў на добразычлівую дапамогу пачынаючым аўтарам, не баяўся адстойваць іх творы…

На рабочым стале, у шуфлядках, у шафах ён імкнуўся падтрымліваць належны парадак. Аднак, напрыклад, у сваёй маленькай кватэрцы на Грушаўцы, у якой жыла і ягоная хворая маці, гэта ўдавалася з вялікай цяжкасцю. У Міколы была багатая бібліятэка, якая наркатычна папаўнялася новымі кнігамі, часопісамі і шматлікімі газетамі. Паэт не шкадаваў грошай на падпіску, яму хацелася не прапусціць літаратурныя навіны, апошнія падзеі ў свеце. Не магу сказаць, ці ўсё яму ўдавалася прачытаць, прааналізаваць. Відаць, нешта адкладвалася на потым і накаплівалася. Хто быў у ягонай кватэры, павінен помніць мноства стопак перыёдыкі, якія не ўмяшчаліся ні на сталах, ні на кніжных палічках, ні ў шафах ці на іх, таму займалі вялікую плошчу на падлозе. На дзіва хутка яму ўдавалася адшукваць патрэбнае выданне — ці ў памяці трымалася, ці была нейкая свая методыка.

Такі ж класічны парадак і акуратнасць прыўносіліся ім і ў творчасць. Ён вучыўся ў класікаў шліфаваць дадзены з іншага вымярэння талент, адшукваючы ў слоўніках нечаканыя вобразы, формы, рыфмы. Мікола вучыўся ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага, жыў у адным пакоі з вядомым расійскім паэтам Юрыем Кузняцовым. Несумненна, расійская паэзія зрабіла на яго вялікі ўплыў. Але было б памылковым акцэнтаваць гэта. Можна пераканацца ў адваротным, зазірнуўшы ў пасмяротны зборнік «Красадзён» — у раздзел перакладаў.

Дарэчы, пра «Красадзён». Да гэтай кнігі паэт ішоў доўга і пакутліва. Ён выношваў у сэрцы назву, карпеў над вершамі, асвойваў форму санетаў. Крыўдзіўся, што некаторыя самаўпэўненыя рэдактары раздзялялі назву на дзве часткі — краса дзён. На самай жа справе гэта была адшуканая ім ягоная «шыпшына», «папараць-кветка», якую слоўнікі тлумачаць як шматгадовую травяністую расліну сямейства лілейных, якая на пачатку лета цвіце прыгожымі ярка-аранжавымі кветкамі. Адкрыццё гэтай не надта вядомай расліны-кветкі для паэта мела вельмі і вельмі важны, загадкава-сакральны сэнс.

Ён адчуваў блізкую смерць, шмат пісаў пра яе ў вершах. Кажуць, вёў спіс вядомых асобаў, якія пайшлі з жыцця менавіта ў тым узросце, у якім і яму было наканавана адысці ў іншы свет: на 54-м годзе 8 студзеня 1997-га на Ражство Хрыстова…

З кнігай «Красадзён» шмат незразумелага. Рукапіс, са слоў жонкі паэта Алены Аляксандраўны, таямніча знік ці то незадоўга да смерці, ці ў час пахавання. Аднаўляць давялося па чарнавых экзэмплярах, запісах і па памяці. Зборнік удалося выдаць, дзякуючы руплівасці Віктара Гардзея, у 2009 годзе ў «Мастацкай літаратуры» праз трыццаць гадоў пасля апошняй прыжыццёвай кнігі «Макаў цвет».

…Я пісаў ужо ў сваіх артыкулах пра верш, у якім паэтам на самым пачатку творчага шляху напрарочаны і асабісты лёс, і лёс знакамітай землячкі Яўгеніі Янішчыц. Нейкая таямнічая сіла падштурхоўвае зноў яго нагадаць чытачам:

Прачыналася рэчка Ясельда
і цякла ў старажытны бор…
Павандрую —
і зноўку я сюды
прынясу маёй страты боль.
Не сунімецца боль
ад дотыку
хвалі ціхай —
нібы сляза…
Пачыналася песня з досвітку
ў барадатых,
сівых лясах.
О дачка задуменнай вернасці —
Ясяльдзянка з касой-красой,
я не веру,
што ты
не вернешся
ў гэта мудрае хараство.
А паверу —
дык песняй раненай
на гарачы ўпаду абрус…
Захвалюецца рэчкай ранішняй
у вачах маіх
Беларусь.

Мікола праз нейкі час пасля нечаканай і не надта зразумелай смерці паэткі апублікаваў верш у «Народнай газеце», перарабіўшы асобныя дэталі, абазначыў, каму менавіта ён прысвячаў твор. А потым і сам памёр за сталом, упаў на «гарачы абрус»… Яшчэ раз перачытайце прарочыя радкі, прааналізуйце жыцці Янішчыц і Федзюковіча, задумайцеся. Гэта вам не «Я памятник себе воздвиг нерукотворный»…

Сёлета яму было б сем дзясяткаў. Ужо пятнаццаць гадоў немагчыма адчуць далікатны поціск ягонай цёплай рукі, зазірнуць то ў самотныя, а то ў лагодна-гарэзлівыя вочы, убачыць прыемна-ветлівую ўсмешку. З ім было цікава размаўляць пра паэзію, пра жыццё. Здаралася, за гаворкай не заўважаўся час. Вось адна з запісак маёй жонцы: «Паважаная Вольга! Пішу табе, шаноўная, раніцай, 19 — у Дзень Вялікага Спаса. Даруй, калі ласка, што я затрымаў Івана, ён невінаваты. Ён пераначаваў у нас. Малайчына. Да сустрэчы. Мікола Федзюковіч. 6 гадзін раніцы 19.08.89 г.»

Тады ж ён падпісаў мне двухтомнік Марыны Цвятаевай. А крыху раней падарыў зборнік Мікалая Глазкова, сказаўшы, што гэты паэт павінен мяне зацікавіць сваімі іранічнымі творамі. Адначасова дадаў кнігу пра творчасць гэтага аўтара. Гартаю старонкі тых і іншых падораных — і ўспамінаю ягоную шчодрасць.

Прыпамінаецца і адна з прагулак па Грушаўцы, калі Мікола распавядаў мне з захапленнем пра творчасць Паўла Васільева, Барыса Карнілава, Ярaслава Смелякова і цытаваў сваім гучным голасам, забыўшыся на прахожых, радкі Смелякова:

Мы шли втроем с рогатиной на слово
и вместе слезли с тройки удалой —
три мальчика,
три козыря бубновых,
три витязя бильярда и пивной.

Напэўна, ён адчуваў сябе таксама віцязям, калі бываў у кампаніі самых сваіх паважаных, лепшых сяброў: таленавітых Міхася Стральцова і Яўгена Крупенькі. Як ён любіў пра іх расказваць, як ганарыўся гэтым сяброўствам! І фатальна прадказваў, што, відаць, памрэ ў 53, як і Яўген. Чамусьці часам паказваў здымкі з іншымі сябрамі-літаратарамі, якіх ужо не было на гэтым свеце, і прарочыў амаль з нейкай упэўненасцю і наканаванасцю свой лёс. Адкуль такая запраграмаванасць і містычнае чаканне — загадка.

І апошняе. На жаль, яшчэ можна купіць «Красадзён» у кігарнях, хаця прайшло пасля выдання каля трох гадоў, а тыраж усяго 1500 экзэмпляраў… Такія цяпер адносіны да паэтаў, да таленавітага ўзнёслага слова…

Аднак мне ўвесь час здаецца, што Мікола Федзюковіч тут, сярод нас. Хочацца верыць: у наступных, пакуль невядомых нам стагоддзях (хацелася б: дзесяцігоддзях), нашчадкі ўсё-такі ўспомняць пра сваіх папярэднікаў. І паэтычная спадчына нашага юбіляра, як і многіх іншых творцаў, будзе запатрабавана, і прарочыя акажуцца словы пра несмяротнасць.

ІНТЭРВ'Ю

Алена Масла: «ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА ПАВІННА ДАВАЦЬ ЧЫТАЧУ АДЧУВАННЕ ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦІ СВЕТУ»

У 2013 годзе ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» абвясцілі конкурс «Экслібрыс» імя Янкі Маўра на лепшы твор у галіне літаратуры для дзяцей. Прыём твораў у самых разнастайных жанрах і формах — ад прозы, паэзіі, драматургіі да коміксаў — працягваецца да 1 жніўня. Сярод сябраў журы конкурса — казачніца, аўтарка некалькіх кніг для дзяцей Алена Масла.

У сённяшняй размове яна распавядае пра спецыфіку працы над творамі для маленькіх чытачоў, пра праблемы і дасягненні беларускай выдавецкай справы і пра тое, як можна выхаваць у дзяцей любоў да кнігі на роднай мове.



Фота Алены Казловай

— Ці можа дзіцячая кніга стаць бэстсэлерам? І ці ёсць у нас аўтары, якія, на вашую думку, маглі б стварыць яго?

Алена Масла: Безумоўна, ёсць. У нас бракуе традыцыі гадаваць дзяцей на сваім — вось гэта праблема. І можна пачаць з таго, што сталася ўжо класікай: напрыклад, «Сярэбраная табакерка» Змітрака Бядулі. Нельга сказаць, што кніга занядбаная ўвагай — яна якраз-такі і перавыдаецца, і спектакль па ёй ішоў... Але проста нейкі менталітэт такі ў нас, што лепшае мы шукаем за светам. Не буду спрачацца: перакладная літаратура — гэта цудоўна. Цудоўна ведаць найлепшыя кнігі замежжа. Але хіба можна гадаваць дзіця, улюбёнага ў родную зямлю, без кніг, створаных яе пісьменнікамі? І ёсць у нас аўтары, якіх трэба выдаваць і перавыдаваць!

— Чаго не хапае беларускай дзіцячай літаратуры?

А.М.: — Найперш не хапае ўвагі з боку грамадства. І гэта агульная для беларускай літаратуры праблема. Літаратура нармальна развіваецца ў адпаведным моўным асяродку, і калі ён вузкі, то з'яўляецца натуральная праблема: чытач маласікі і неабазнаны. Мне даводзіцца шмат сустракацца са школьнікамі, і ў большасці аўдыторыяў узнікае неабходнасць не творы чытаць, а праводзіць ліквідацыю непісьменнасці — то бок тлумачыць простыя беларускія словы. І самае кепскае, што сітуацыя за апошнія гады толькі пагоршылася. Мову дрэнна ведаюць не толькі ў гарадскіх, але ўсё часцей — і ў вясковых школах. Чытаю, да прыкладу, для малодшых класаў адну са сваіх казак, разбіраем лексіку. Колькі намаганняў прыкладаем, каб знайсці дзяўчынак у спадніцах, карункі на адзенні, а яшчэ высветліць, што ж такое аладкі і патэльня! Казка невялікая, амаль усю ўрэшце па слоўцах і разбіраем... І ў старэйшых класах веданне мовы не лепшае. Можна адкрыта казаць пра наяўнасць моўнага бар'еру паміж творцам і патэнцыйным чытачом.

Другой перашкодай для папулярызацыі беларускай дзіцячай літаратуры з'яўляюцца мізэрныя наклады, якімі выдаюцца кніжкі. Дзве, тры тысячы — я ўжо не кажу пра наклады ў трыста, пяцьсот асобнікаў, — для дзіцячай кнігі гэта вельмі мала... Дык чым пісьменнік, якога не чыталі, павінен быць цікавым?

— У якой краіне, на Ваш погляд, дзіцячая літаратура цяпер пачуваецца найлепш і чаму?

А.М.: — Я не магу ўзяць на сябе смеласць за ўсе краіны адказаць, але дакладна ведаю адно: беларуская кніга выжывае ў складаных умовах. Пра моўную праблему мы згадвалі. А яшчэ ж і падаткаабкладанне на кнігавыданне, якое даўно ўжо абяцаюць зрабіць ільготным у нашай краіне, ды ніяк не адважацца...

Як прыклад згадаем Швецыю, дзе існуе льготнае падаткаабкладанне, якое дае магчымасць прадпрымальным людзям развіваць кнігавыдавецтва як бізнэс. Ды дзеля такога прыкладу і за мора не трэба хадзіць! У суседняй Украіне, Расіі сітуацыя з падаткаабкладаннем на кнігі зусім іншая.

— Што трэба зрабіць, каб выдадзеная дзіцячая кніга ўсё ж дайшла да чытача?

А.М.: — Найперш тое, што называецца піярам. Сустрэчы, прэзентацыі. Трэба ладзіць сустрэчы з аўтарамі і запрашаць не толькі дзяцей, але дарослых, бо менавіта яны павінны купіць і прынесці кнігу свайму дзіцёнку. Неабходна не саромецца і не ленавацца, а займацца «раскруткай», інакш кажучы, «кніга — нагода для падзеі».

— Ці можна прывесці тут станоўчы прыклад рэкламы кнігі, і прыклад, калі добрая кніга засталася незаслужана незаўважанай?

А.М.: — Добрым прыкладам тут можна назваць тую работу, якую вяла па прапагандзе кніг сваіх аўтараў амбасада Швецыі. Згадайма прэзентацыю, якая ладзілася з нагоды выхаду кнігі «Піпі Доўгаяпанчоха», калі ў Мінск прыехала дачка пісьменніцы Астрыд Ліндгрэн Карын Нюман — тая самая дзяўчынка, якая шмат гадоў таму прыдумала імя для гераіні і натхніла на напісанне твора. А калі пачалі выходзіць кнігі Юі Віслàндэр — якія святы ладзіліся! Лямцавы тэатрык ставіў спектаклі пра Маму Му, і з гэтым спектаклем акцёры не толькі ў Мінску выступалі, але ездзілі па Беларусі... Прыязджаў Ульф Старк — і таксама ладзілася яскравая прэзентацыя яго «Дыктатара». Да таго ж, нікога са стваральнікаў кнігі не пакідалі па-за ўвагай: запрашаліся перакладчыкі Зміцер Плакс, Надзея Кандрусевіч, шведскія літаратуразнаўцы і пісьменніцы Улу Лундквіст і Яніна Арлоў, — словам, амбасадай рабілася ўсё магчымае, каб як найлепей прэзентаваць дзіцячыя кнігі сваёй краіны беларускаму чытачу — і тым самым прэзентаваць саму краіну...

Перакананне, падмацаванае практыкай: дзеці чытаюць там, дзе дарослыя — бацькі, выхавацелі, настаўнікі, бібліятэкары — любяць кнігу і ўмеюць з ёй працаваць.

А сумным жа прыкладам, калі добры твор застаўся невядомым шырокай публіцы, на маю думку, можна назваць сітуацыю з кнігай Сержука Вітушкі «Дзінь-дзілінь: пара гуляць у казкі». Вельмі люблю гэтую кнігу і мару пра часы, калі яна знойдзе выхад на масавага чытача і, што самае істотнае, знойдзе яго падтрымку і разуменне.

І яшчэ... Калі ў Мінску ўсё ж нешта раз-пораз ладзіцца, то ў рэгіёнах людзі і праз гады не ведаюць пра выхад той ці іншай кнігі. У шмат якіх малых гарадах проста пазачыняныя кніжныя крамы, а ў тых, якія ёсць, беларуская кніга нярэдка — на самых далёкіх паліцах. Праўда, дзеля справядлівасці варта зазначыць, што пару-тройку апошніх гадоў неяк да гэтай праблемы пачынаюць паварочвацца тварам. Ва ўсякім разе, дбаць пра тое, каб кніжная крама адпавядала свайму прызначэнню, а не была філіялам гаспадарчай крамы, дзе кнігі суседнічаюць з пральнымі парашкамі.

— Ці ёсць у Вас парада для тых хто піша (спрабуе пісаць) для дзяцей, як стаць сапраўдным дзіцячым пісьменнікам?

А.М.: — Аўтары па-рознаму пачынаюць пісаць для дзяцей. Астрыд Ліндгрэн, напрыклад, пісала толькі для дзяцей, а нехта піша і для дарослых таксама. Некаторыя пачынаюць пісаць, стаўшы бацькамі, некаторыя — дзядулямі... Ну, але, мне падаецца, не варта ставіць так сабе задачу: стаць сапраўдным дзіцячым пісьменнікам! Нашмат важней умець слухаць тое дзіця, што жыве ў табе самім, памятаць пра свае перажыванні і сваё ўспрыняцце свету — вось тады з'яўляюцца шансы нешта добрае напісаць.

Наогул жа для фарміравання якаснай дзіцячай літаратуры трэба, каб было шмат разнастайных твораў. Каб нешта ў выніку выкрышталізавалася, літаратурны працэс не павінен стаяць на месцы.

Слушна заўважыла шведскі крытык Яніна Арлоў, што з амаль 2000 кніг для дзяцей, якія выходзяць у Швецыі, далёка не ўсе — шэдэўры. Але гэта чытво на розныя ўзроўні чытачоў, на розны густ. А застанецца — лепшае, час адсее аднадзёнкі.

— Якія асаблівасці ўласцівыя творам для дзяцей, якія тэмы найбольш актуальныя, што глабальна адрознівае дзіцячую і дарослую кнігі?

А.М.: — Наўрад нехта ведае ўніверсальны рэцэпт стварэння дзіцячай кнігі. Але відавочна ёсць пэўныя асаблівасці, звязаныя найперш з надзвычайнай датклівасцю дзяцей. Дзеці — гэта людзі з агаленымі нервамі, яны вострa адчуваюць фальш. Таму ў развагах пра ўніверсальны рэцэпт абмяжуюся вельмі слушнай парадай Астрыд Ліндгрэн: «Пісаць для дзяцей трэба таксама, як для дарослых, толькі значна лепш».

Наогул, дзіцячая літаратура — гэта не маналіт. Гэта шматжанравая літаратура, якая ствараецца з улікам псіхалогіі дзіцяці. Дзіця адмалку — частка грамадства, і ўсё, што ў грамадстве адбываецца, самым непасрэдным чынам датычыць дзяцей. Добрая кніга можа стаць найлепшым сябрам, калі дапаможа знайсці адказы на жыццёвыя пытанні, урэшце, падорыць незабыўныя хвіліны эмацыйнага ўзрушэння ці вострых перажыванняў.

— На ваш погляд, дзіцячы пісьменнік павінен быць педагогам?

А.М.: — Педагог, уласна кажучы, гэта той, хто ўмее знайсці падыход да дзіцяці (не блытаць з нуднымі «вучылкамі»!). Ну дык і дзіцячы пісьменнік мае права называцца добрым педагогам, калі ён знайшоў сцежку да сэрца свайго чытача. Іншае справа, што дзіцячая літаратура, бывае, грашыць павучаннямі і маралізатарствам. Такія творы нярэдка вельмі любяць школьныя настаўнікі і выхавацелі садкоў, але часам не вельмі любяць самі дзеці...

— Ці не перасталі сучасныя дзеці быць наіўнымі, можа, ім больш не патрэбныя казкі з добрымі чароўнымі істотамі, а патрэбныя самалёты, кампутары і астатнія рэаліі дарослага свету?

А.М.: — Якія б ні былі тэхналогіі, як бы ні развівалася цывілізацыя, чалавек кардынальна не мяняецца. Таму ніхто не пераканае мяне, што фундаментальныя традыцыйныя каштоўнасці страчваюць актуальнасць і не цікавыя дзецям. Мумітролі Туве Янсэн жывуць у дзіўным свеце каметаў, прыгодаў, вандровак — іх жыццё насычанае смелымі самастойнымі рашэннямі і рызыкоўнымі выправамі, але яны вяртаюцца дадому, дзе мачі пячэ булачкі, а тата чытае газету — у дом, дзе іх любяць і чакаюць. Вось прыклад удалага спалучэння казачнага і тых грунтоўных сямейных і чалавечых каштоўнасцяў, якія, я лічу, патрэбны дзіцячай літаратуры. Акрамя іншых складнікаў, дзіцячая кніга павінна даваць чытачу адчуванне добразычлівасці свету.

— Калі б Вам прапанавалі даць назву прэміі для дзіцячай літаратуры, як бы яна называлася?

А.М.: — Ведаеце, я нядаўна думала пра гэта. Да прыкладу, у Беларусі ёсць прэміі імя Янкі Маўра, Васіля Віткі ў часопісе «Вясёлка», Міжнародная прэмія імя Астрыд Ліндгрэн, заснавана шведамі, — усё гэта добра і традыцыйна.

А вось у суседняй Украіне ёсць прэстыжная прэмія «Вялікі Вожык» — і мне падобны падыход вельмі падабаецца. Наша «Літаратурнае прадмесце» мае прэмію «Блакітны Свін» — крэатыўна і весела!


А ў выпадку з прэміяй за лепшы дзіцячы твор і пагатоў так быць павінна. Можа, назва «Журавінка.by» падышла б? Вітамінна, карысна, прыгожа — і вельмі па-беларуску!

Гутарыў Усевалад Сцебурака

ВЕРШЫ

ЯК ДУХ ЛЯСНЫ…

Васіль ЗУЁНАК



Шпаку відно!

Я сёння склаў не гімн — адзін радок:
Я песеньку шпачыную прыдумаў.
Хоць слоў няма — ды весні галасок
Птушыны мой гудзе зялёным шумам.

З бярозы сустракаю сонца ўсход
Не дзюбачкай шпачынаю, а лікам.

— Вясна ідзе! Ці бачыш ты, народ?!
Шпаку відно!
Як добра быць вялікім!..

Аб чым яны?..

Між пералескаў жыта палавее,
Пад ветрыкам шапочуць каласы…
Гамонку чую, ды не разумею, —
Забыўся мову?.. жытняй вёскі сын…

Аб чым яны? — ніхто мне не адкажа,
Апроч мяне, апроч маёй душы:
І гэты васілёк, што неба ўважыў —
Не кінуў сіняву пад лемяшы;

І гэты чмель у летуценні мёдным,
Што хатку пад узмежкам збудаваў;
І з плачкаю нязводнай і бязроднай
Зязюля — спаконвечная ўдава;

І гэта сцежка; і амаль музейны
Жаўрук над ёй?..

Аб чым яны ў той міг?..

А можа, не майго ўсёразумення,
А просяць, каб душой пачуў я іх?..

***

Варона на ліпе рупіцца:
Галінкі сухія ламае.
Няўжо, каб агеньчык у грубачцы
Зачапліць, дроўцы збірае?

А што — і пагрэцца не шкодзіць,
А то і «спачыеш у бозе»…
Ды не! — зіма адыходзіць,
І ўжо вясна на парозе!

І хоць зябкавата на золаку —
Зусім не мароз вінаваты:
Сушняк, як бярвенне волакам,
Варона тралюе на хату.

***

Быццам быў за ўсіх мудрэй —
З пёркам панаваў.
Гульні ў ямб альбо харэй
Працай называў…

Браў жыццё, як напавер, —
З рук усё сплыло.
Пасля дожджыка ў чацвер
Весела было…

Пазубрылася каса,
З'ела плуг іржа…
І не ўдачы паласа,
А ў быллі мяжа…

Час прыйшоў — а чым аддаць?
Цягнецца рука:
Спадзяецца зноў, відаць,
Каб нашармака…

Літасцівыя ж якраз
Знойдуцца — бо ёсць.
Люб ім з рыфмай напаказ
Пажыццёвы госць…

Не крыжуйце ж мне душу,
Не пладзіце сноў:
Напавер, я вас прашу,
Не давайце зноў!..

***

Май, не пакінуўшы слядоў,
Адкрыў у чэрвень дзверы,
А я і ў замеці гадоў
Вясне наіўна веру.

Вясна-красна! Вясна-красна
І ў сем і ў сем дзясяткаў.
Непадуладная яна
Асенніх сноў парадкам.

Я тут чужы, я тут не свой:
Хоць час гняце палонам,
Хлапчук з сівою галавой,
Гляджу на свет здзіўлёна.

З тым хлапчуком удвух нясём
І радасці, і гора
І бласлаўляем сёння ўсё
З прадаўнішняга ўчора.

Мільгнула — як і не было,
Як знічкай адгарэла.
Шкада? Ну, пэўна ж… А крыло
Над намі зачарнела…

Я дзён у Бога не прасіў
(А дзён у Бога многа!) —
Як быццам і не жыў зусім…
Адкуль жа ты, трывога?

Адкуль шчымлівы халадок?..
Бушуе дзень раскошай:
Сувой і ўток, — за крокам крок,
І кожны — як апошні…

Дзесяць радасцяў

Я спытаўся сёння ў дрэўца:
«А ці помніш, мой дубочку,
Як на сонечнай сугрэўцы
Ты быў простым жалудочкам?

Як спяліўся, як зваліўся
І злякаўся адзінока,
Як карэніста ўхапіўся
За зямлю, — ды так глыбока!

Помніш, дзіву я даваўся:
Сам маленькі, а стрыжнёвы
Корань твой у дол хаваўся,
Пэўна, з вырастам сажнёвым.

Ты пясок пранізваў сыпкі
І памог мне здагадацца,
Што спярша расцеш углыбкі,
Каб увысь пасля падацца.

Каб магутна развінуцца
І ствалом і пышнай кронай
І ў вяках не пахіснуцца
З той глыбіннай абаронай.

Помніш, як я выбачаўся,
Засмучоны быў дарэшты,
Што адсек — не дакапаўся
Глыбіні, якой жывеш ты.

Не падумаў, што твой вырай,
Можа, большай быў віною,
Што цябе я з лесу вырваў,
Не спытаў, якой цаною…

Помніш, як маім суседам
Ты пакутна прыжываўся, —
З парасткаў тваіх тым летам
У жывых адзін застаўся

Тры лісцінкі — як надзея,
А праз год — ужо дзясятак, —
Так з унукам мы глядзелі
Праз вякі з табой ад хаты.

Ты з лісцінкай кожнай радасць —
Дзесяць радасцяў! — прынёс нам,
І стагоддзяў далягляды,
І — як лёс — нашчадкаў вёсны.

Да сонца!..

Пах бярэсты
На далані.
Лес чадзее.
Чую гул з-пад зямлі:
Карані
Загулі.
Карані
Здабылі
Надзею!

Чую:
Ранак яшчэ тупаціць
Марозлівым
Крокам.
Ды вясна
Бярозай
Трымціць,
Набрыняла
Да сонца ляціць
З-пад зямлі —
Па камлі,
Па галінах высокіх, —
Бярозавым
Сокам!

***

Паехаў я ў той час
З Мачулішча,
Як Нача ў нас
Ракою чулася,
Калі жылі
Пры лямпе газавай,
І п'яніцы яшчэ слылі
Страшней, чым хворыя праказаю.

А сёння — як на грудзі
Камень, —
Гняце:
Што будзе
З землякамі?!.
Зімой і летам,
Вясной і восенню, —
За ўсю планету —
П'юць без просыпу.

І пры электрыцы,
І пры «тэлеку»
Ўдрабядан «лечацца»,
«У сцельку».
Ці будзень чорны,
Ці Ушэсце —
Баль нескончоны:
П'яных шэсце.

Па лужах чунямі
Валёнкі хлюпаюць…
«Галё, мачулінцы,
Прывезлі, любую!..»
Па снезе тапачкі
Трымцяць марозліва…
«А сёння, бабачкі,
Вярмут у розліве!..»

Ідзе Мачулішча,
За плот
Трымаецца, —
Народ
Карчуецца,
Народ
Співаецца…

***

Як прадчуванне
Катастроф
Сваё маўчанне
Нам весціць Бог.

А мы ў бязвер'і —
Хто ўлёт, хто ніц —
Шукаем дзверы
Да таямніц.

І ўжо здаецца,
Што мы ад іх
Трымаем лейцы
Ў руках сваіх.

Вось-вось настане
Трыумф — але
Адно пытанне
Сто новых шле…

Вачыма Бога
Ў Сусвет глядзім…
Пытанняў многа,
Адказ адзін…

***

А ўсе надрэччы белыя
І паручэўі ўсе:
Чаромха, расквітнелая,
Убрад вясну нясе.

А тут — над песняў песняю —
Ды салаўіны спеў!.. —

Ці гэтак я развеснены?
Ці свет асалавеў?

Палітыка

Хата як хата, ды нельга зайсці:
Дзверы маюцца, ды без клямкі.
І грунт — нібыта ў балотным трысці:
Дарог няма — толькі напрамкі…

Хамурапі

Конь канае. У пеністай храпе
Цуглі золатам зіхацяць.
Дзе ты, хто ты, цар Хамурапі, —
Я не знаў — і не буду знаць.

Пакацілася калясніца —
За гарамі вякоў Вавілон.
Толькі мне неадступна сніцца
Хамурапі акрутны закон.

І зусім не «да нашай эры»:
Я — у нашай, і свой сатрап
Мне такія стандарты адмерыў,
Каб я ведаў: хто цар, а хто раб.

Каб я помніў: адмерлі шумеры,
Клінапісныя знакі маўчаць…
Каб і я, нарэшце, паверыў,
Што ўжо час і мне адміраць…

Як на ўбой, каб і я пакачаўся
Ля карыта: паеў ды ў хлеў.
Каб я знаў: гаспадар зачакаўся:
Хоць свінячы — пачуць хваласпеў…

Каб і мне гісторыі млёва
Ад цароў ухапіць на замес,
Каб мой верш мітусіўся лісліва
Перад тым, хто на трон залез…

Каб адчуў: з удзячнасцю рабскай,
Запрадаўшы волю сваю,
У кампаніі хамурапскай
Са смяротнікам-словам стаю…

Каб і я сказаць не патрапіў,
Што аднойчы мне Бог адкрыў:
Не было і няма Хамурапі,
Покуль сам ты яго не стварыў…

Аншлаг

А мы шпака падкармліваем:
Шпачаняты ў яго — будзь здароў! —
Не застануцца карлікамі —
Харчацца з нашых дароў.

Вырасце й песня крылатая:
Налета бярозавы збор
Будзе над нашаю хатаю —
Цэлы шпачыны хор! —

І аншлаг!..

▸ ФРАГМЕНТЫ НОВАЙ КНІГІ

ЧАС SECOND-HAND

(КАНЕЦ ЧЫРВОНАГА ЧАЛАВЕКА)

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ



Запіскі саўдзельніка

Мы развітваемся з савецкім часам. З тым нашым жыццём. Я спрабую сумленна выслухаць усіх удзельнікаў сацыялістычнай драмы…

У камунізма быў вар'яцкі план: перарабіць «старога» чалавека, трухлявага Адама. І гэта атрымалася… можа быць, адзінае, што атрымалася. За семдзесят з лішкам гадоў у лабараторыі марксізму-ленінізму вывелі асобны чалавечы тып: «homo soveticus». Адны лічаць, што гэта трагічны персанаж, іншыя называюць яго «саўком». Мне здаецца, я ведаю гэтага чалавека, ён мне добра знаёмы, я побач з ім, плячо да пляча пражыла шмат гадоў. Ён — гэта я. Гэта мае знаёмыя, сябры, бацькі. Некалькі гадоў я ездзіла па ўсім былым Савецкім Саюзе, таму што homo soveticus — гэта не толькі рускія, але і беларусы, туркмены, украінцы, казахі… Цяпер мы жывём у розных дзяржавах, якія гавораць на розных мовах, але нас ні з кім не пераблытаеш. Пазнаеш адразу! Усе мы, людзі з сацыялізму, падобныя і не падобныя на астатніх людзей — у нас свой слоўнік, свае ўяўленні пра дабро і зло, пра герояў і пакутнікаў. У нас адмысловыя адносіны са смерцю. Увесь час у аповедах, якія я запісваю, рэжуць вуха словы: «страляць», «расстраляць», «ліквідаваць», «пусціць у расход» ці такія савецкія варыянты знікнення, як: «арышт», «дзесяць гадоў без права перапіскі», «эміграцыя». Колькі можа каштаваць чалавечае жыццё, калі мы памятаем, што нядаўна гінулі мільёны? Мы поўныя нянавісці і забабонаў. Усё адтуль, дзе быў ГУЛАГ і страшная вайна. Калектывізацыя, раскулачванне, перасяленне народаў…

Гэта быў сацыялізм, і гэта было проста наша жыццё. Тады мы мала пра яго гаварылі. А цяпер, калі свет незваротна змяніўся, усім стала цікавым тое нашае жыццё, усё роўна якім яно было, гэта было наша жыццё. Пішу, адшукваю па макулінках, па драбках гісторыю «хатняга»… «унутранага» сацыялізму. Тое, як ён жыў у чалавечай душы. Мяне заўсёды прыцягвае вось гэтая маленькая прастора — чалавек… адзін чалавек. Насамрэч там усё і адбываецца. <…>

Савецкая цывілізацыя… Спяшаюся захаваць яе сляды. Знаёмыя твары. Распытваю не пра сацыялізм, а пра каханне, рэўнасць, дзяцінства, старасць. Пра музыку, танцы, прычоскі. Пра тысячы падрабязнасцяў зніклага жыцця. Гэта адзіны спосаб загнаць катастрофу ў межы звыклага і паспрабаваць штосьці распавесці. Пра штосьці здагадацца. Не стамляюся дзівіцца таму, якое цікавае звычайнае чалавечае жыццё. Бясконцая колькасць чалавечых праўдаў… Гісторыю цікавяць толькі факты, а эмоцыі застаюцца за бортам. Іх не прынята ўпускаць у гісторыю. Я ж гляджу на свет вачыма гуманітарыя, а не гісторыка. Здзіўлена чалавекам… <…>

ГІСТОРЫЯ АДНАГО ДЗЯЦІНСТВА

Марыя Вайцяшонак, пісьменніца, 57 гадоў



– Я — асадніца. Я нарадзілася ў сям'і ссыльнага польскага афіцэра-асадніка (osadnik — па-польску «пасяленец», які атрымаў землі на Усходніх Крэсах пасля заканчэння савецка-польскай вайны ў 1921-м годзе). А ў 1939-м (сакрэтны пратакол пакта Молатава–Рыбентропа) Заходнюю Беларусь далучылі да СССР, і тысячы асаднікаў-каланістаў разам са сваімі сем'ямі былі высланы ў Сібір як «небяспечны палітычны элемент» (з цыдулкі Берыі — Сталіну). Але гэта вялікая гісторыя, а ў мяне свая… маленькая…

Не ведаю дня свайго нараджэння… і нават года… Усё ў мяне прыблізнае. Не знайшла ніякіх дакументаў. Я ёсць, і мяне няма. Не памятаю нічога і памятаю ўсё. Я думаю, што мама з'язджала цяжарная мной. Чаму? Мяне заўсёды хвалююць паравозныя гудкі… і пах шпалаў… і плач людзей на станцыях… Магу ехаць добрым, фірмовым цягніком, але прагрукоча побач таварняк, і ў мяне слёзы. Не магу бачыць вагоны для скаціны, чуць роў жывёл… Нас везлі ў гэтых вагонах. Мяне яшчэ не было. І я была. У мяне ў снах няма твараў… сюжэтаў… усе мае бачанні з гукаў… пахаў…

Алтайскі край. Горад Змеінагорск, рака Змееўка… Ссыльных згрузілі за горадам. У возера. Жыць пачалі ў зямлі. У зямлянках. Я нарадзілася пад зямлёй, вырасла там. Зямля мне з дзяцінства пахне домам. Цячэ са столі, адрываецца камяк зямлі, зваліўся і скача да мяне. Гэта — жаба. Але я маленькая, я яшчэ не ведаю, каго трэба баяцца. Сплю з дзвюма козачкамі, на цёплай падсцілцы з казінага «гарошку»… Першае слова «ме-е-е»… першыя гукі… а не «ма»… «мама». Старэйшая сястра Уладзя ўспамінала, як я дзівілася, што козачкі не размаўляюць, як мы. Маё здзіўленне. Яны здаваліся мне роўнымі. Свет быў цэласны, непадзельны. Я і цяпер не адчуваю гэтай розніцы паміж намі, паміж людзьмі і жывёламі. Заўсёды размаўляю з імі… і яны мяне разумеюць… А жучкі, павучкі… яны таксама былі побач… такія каляровыя, такія размаляваныя жучкі. Мае цацкі. Увесну мы разам выбіраліся на сонца, поўзалі па зямлі, шукалі ежу. Грэліся. А ўзімку абміралі, як дрэвы, упадалі ў спячку ад голаду. У мяне свая школа, мяне вучылі не толькі людзі. Я чую і дрэвы, і траву. Больш за ўсё ў жыцці мне цікавыя жывёлы, сапраўды цікавыя. Як мне адлучыцца ад таго свету… ад тых пахаў… Не магу. Вось нарэшце сонца! Лета! Я — наверсе… вакол прыгажосць асляпляльная, і ніхто нікому не рыхтуе ніякай ежы. І яшчэ ўсё гучыць, усё ў фарбах. Я спрабую на смак кожную травінку, лісток… кветку… усе карэньчыкі… блёкату раз наелася, ледзь не памерла. Цэлыя карціны ў памяці… Памятаю гару «Сіняя барада» і сіняе святло на гэтай гары… асвятленне… Святло ішло менавіта з левага боку, са схілу. Ішло яно зверху ўніз… Якія гэта былі відовішчы! Баюся, што ў мяне не хопіць таленту гэта перадаць. Уваскрасіць. Словы — гэта толькі дадатак да стану. Да нашых пачуццяў. Чырвоныя макі, лілеі-саранкі, мар'ін корань… Усё гэта рассцілалася перад вачыма. Пад нагамі. Ці іншая карціна… Я сяджу поруч нейкай хаты. Па сцяне паўзе сонечная пляма… і яна розных колераў… увесь час змяняецца. Доўга-доўга сяджу на тым месцы. Калі б не гэтыя фарбы, я б, напэўна, памерла. Не выжыла. Не памятаю, што мы елі… ці была ў нас якая-небудзь чалавечая ежа…

Увечар я бачыла, як ішлі чорныя людзі. Чорныя адзенні, чорныя твары. Гэта ссыльныя вярталіся з руднікоў… яны ўсе былі падобныя на майго бацьку. Я не ведаю, ці любіў мяне бацька. Ці любіў мяне хто-небудзь?

У мяне вельмі мала ўспамінаў… Мне іх бракуе. Шукаю ў цемры, імкнуся больш адтуль выцягнуць. Рэдка… вельмі рэдка раптам штосьці ўспомніцца, чаго я не памятала. Мне горка, але я шчаслівая. Я тады страшна шчаслівая.

Нічога не магу ўспомніць пра зіму… Узімку я сядзела ў зямлянцы ўвесь дзень. Дзень быў падобны на вечар. Усё ў змярканні. Ніводнай каляровай плямы… Ці былі ў нас нейкія рэчы, акрамя місак і лыжак? Ніякай адзежы… каб штосьці з адзежы… абгортваліся нейкімі анучамі. Ніводнай каляровай плямы. Абутак… Што з абутку? Галёшы… памятаю галёшы… у мяне таксама галёшы, вялікія і старыя, як у мамы. Напэўна, маміны… Першае паліто мне выдалі ў дзіцячым доме, і першыя рукавіцы. Капялюшык. Памятаю: у цемры ледзь-ледзь бялее твар Уладзі… Цэлымі днямі яна ляжыць і кашляе, яна захварэла на рудніках, у яе сухоты. Я ўжо ведаю гэтае слова… Мама не плача… Не памятаю, каб мама плакала, яна мала гаварыла, а потым, мабыць, наогул перастала размаўляць. Калі кашаль адыходзіць, Уладзя кліча мяне: «Паўтарай за мной… Гэта — Пушкін». Я паўтараю: «Мороз и солнце, день чудесный! Еще ты дремлешь, друг прелестный!». І ўяўляю сабе зіму. Як у Пушкіна.

Я рабыня слова… я слову веру абсалютна… Заўсёды чакаю слоў ад чалавека, і ад незнаёмага чалавека таксама, ад незнаёмага нават больш чакаю. На незнаёмага чалавека яшчэ можна спадзявацца. Як быццам і самой хочацца сказаць… і я рашаюся… Гатовая. Калі я пачынаю камусьці распавядаць, потым на тым месцы, пра які я казала, я нічога ўжо не знаходжу. Там пустэча, я губляю гэтыя ўспаміны. Там імгнення — дзірка. І трэба доўга чакаць, каб яны вярнуліся. Таму я маўчу. Я ўсё апрацоўваю ў сабе. Хады, лабірынты, норкі…

Шматкі… Адкуль у мяне ўзяліся гэтыя шматкі і абрэзкі? Рознакаляровыя, шмат малінавага колеру. Хтосьці мне іх прынёс. З тых шматкоў я шыла маленькіх чалавечкаў, стрыгла сабе валасы, рабіла ім прычоскі. Гэта былі мае сяброўкі… Лялек я не бачыла, нічога не ведала пра лялькі. Жылі мы ўжо ў горадзе, але не ў доме, а ў склепе. Адно сляпое акенца. Але ў нас ужо з'явіўся адрас: вуліца Сталіна, дом сямнаццаць. Як і ў іншых… як і ва ўсіх… у нас ужо быў адрас. Там я гуляла з адной дзяўчынкай… дзяўчынка была не са склепа, а з дома. Хадзіла ў сукенках і ў чаравічках. А я — у мамчыных галёшах… Я прынесла ёй паказаць гэтыя шматкі, на вуліцы яны глядзеліся яшчэ прыгажэй, чым у склепе. Дзяўчынка пачала іх у мяне прасіць, на штосьці хацела выменяць тыя шматкі. Я — ні за-вошта! Прыйшоў яе тата: «Не сябруй з гэтай жабрачкай», — сказаў ён. Я зразумела, што мяне ўзялі і адсунулі. Мне трэба ціха сыйсці, хутчэй сыйсці з гэтага месца. Вядома, гэта ўжо сталыя словы, не дзіцячыя. Але пачуццё… тое пачуццё я памятаю… Табе так балюча, што ўжо няма крыўды і няма жалю да сябе, у цябе раптам многа-многа свабоды. А літасці да сябе няма… Калі літасць ёсць, то чалавек яшчэ не так глыбока зазірнуў, ён яшчэ не сыйшоў ад людзей. А калі ён сыйшоў, людзі яму зусім не патрэбныя, яму хапае таго, што ў ім самім. Я занадта глыбока зазірнула… Мяне цяжка пакрыўдзіць. Я рэдка плачу. Мне смешныя ўсе звычайныя беды, жаночыя крыўды… Для мяне гэта шоў… шоў жыцця… Але калі я пачую, што плача дзіця… ніколі не міну жабрака… Ніколі не міну. Пах гэты я памятаю, пах бяды… Нейкія хвалі ідуць, я дагэтуль да іх падлучана. Гэта пах майго дзяцінства. Маіх пялюшак.

Я іду з Уладзяй… мы нясём пуховую хустку… Прыгожую рэч для нейкага іншага свету. Падрыхтаваная замова. Уладзя ўмела вязаць, на тыя грошы мы жылі. Жанчына разлічылася з намі, а потым кажа: «Давайце я вам нарэжу кветак». Як — нам букет? Стаім дзве папрашайкі, у нейкай мешкавіне… галодныя, халодныя… І нам — кветкі! Мы заўсёды думалі толькі пра хлеб, а гэты чалавек здагадаўся, што мы здольныя думаць яшчэ пра нешта. Ты быў замкнёны, замураваны, а табе адкрылі фортку… акно расчынілі… Аказваецца, акрамя хлеба… акрамя ежы… нам можна даць і букет кветак! Значыць, мы нічым ад іншых не адрозніваемся. Мы… такія ж… Гэта было парушэннем правілаў: «Давайце я вам нарэжу кветак». Не нарву, не збяру, а нарэжу ў сваім садзе. З гэтага моманту… Магчыма, гэта быў мой ключ… мне далі ключ… Мяне гэта перавярнула… Я памятаю той букет… вялікі букет касмей… Цяпер заўсёды іх саджаю ў сябе на дачы. *(Мы сядзім якраз у яе на дачы. Растуць тут адны кветкі і дрэвы.)* Я нядаўна ездзіла ў Сібір… Горад Змеінагорск… вярнулася туды… Шукала нашую вуліцу… наш дом… наш склеп… Але дома ўжо няма, дом знеслі. Ва ўсіх пытала: «А вы памятаеце?» Адзін стары ўспомніў: так, у склепе жыла прыгожая дзяўчына, яна хварэла. Людзі больш запамінаюць прыгажосць, чым пакуту. І букет нам падарылі, таму што Уладзя была прыгожая.

Я пайшла на могілкі… Ля самых варотаў стаяла вартоўня з забітымі вокнамі. Доўга стукала. Выйшаў вартаўнік, ён быў сляпы… Што за знак? «Не скажаце, дзе хавалі ссыльных?» — «А… та-а-ам…» — і махнуў рукой ці

то ўніз, ці то ўгару. Нейкія людзі павялі мяне ў самы далёкі кут… Адна трава там… адна трава… Уначы не спала, таму што задыхалася. Спазм… такое пачуццё, што хтосьці мяне душыць… Уцякла з гасцініцы на станцыю. Пешшу праз увесь пусты горад. Станцыя была зачынена. Села на рэйкі і да раніцы чакала. На адхоне сядзелі хлопец з дзяўчынай. Цалаваліся. Развіднела. Прыйшоў цягнік. Пусты вагон… Увваходзім: я і чацвёра мужчынаў у скураных куртках, голеныя, падобныя да крымінальнікаў. Пачалі частаваць мяне агуркамі і хлебам. «Бум у карты гуляць?» Мне не было страшна.

Нядаўна ўспомніла… Ехала і ўспомніла… у тралейбусе ехала… Як Уладзя спявала: «Я могилу милой искал / Но найти ее нелегко…». А аказваецца, любімая песня Сталіна… калі яе спявалі, ён плакаў… І я яе адразу разлюбіла, гэтую песню. Да Уладзі прыходзілі сяброўкі, звалі на танцы. Я ўсё гэта памятаю… Мне было ўжо шэсць ці сем гадоў… Я бачыла, як у трусы замест гумкі яны зашывалі дрот. Каб нельга было сарваць… Там жа адны ссыльныя… зэкі… Забівалі часта. Пра каханне я таксама ўжо ведала. Да Уладзі прыходзіў прыгожы хлопец, калі яна хварэла — ляжала ў нейкіх анучах, кашляла. А ён так на яе глядзеў…

Мне балюча, але гэта — маё. Я нікуды ад яго не бягу… Не магу сказаць, што я ўсё прыняла, удзячная за боль, тут трэба нейкае іншае слова. Цяпер я яго не знайду. Ведаю, што ў гэтым стане я далёка ад усіх. Я адна. Узяць пакуту ў свае рукі, валодаць ёй цалкам і выйсці з яе, штосьці адтуль вынесці. Гэта такая перамога, толькі ў гэтым ёсць сэнс. Ты не з пустымі рукамі… А інакш навошта было спускацца ў пекла?

Вось хтосьці падводзіць мяне да акна: «Паглядзі, вунь вязуць твайго бацьку…». Незнаёмая жанчына цягнула штосьці на санках. Кагосьці ці штосьці… захутанае ў коўдру і перавязанае вяроўкай…

Потым мы з сястрой хавалі нашу маму. Засталіся адны. Уладзя ўжо ледзь хадзіла, у яе аднімаліся ногі. Скура адслойвалася як папера. Ёй прынеслі бутэлечку… Я думала, што гэта лекі, а гэта была нейкая кіслата. Атрута. «Не бойся…» — паклікала яна мяне і дае гэтую бутэлечку. Яна хацела, каб мы разам атруціліся. Я бяру гэтую бутэлечку… Бягу і кідаю яе ў печ. Шкло разбіваецца… Печ была халодная, там даўно нічога не варылася. Уладзя заплакала: «Ты ўся ў бацьку». Хтосьці нас знайшоў… Можа, яе сяброўкі? Уладзя ляжала ўжо ў непрытомнасці… Яе — у лякарню, мяне — у дзіцячы дом.

Бацька… Я хачу яго ўспомніць, але як ні намагаюся, не бачу яго твара, няма ў маёй памяці яго твара. Потым я ўбачыла яго, маладога, на фатаграфіі ў цёткі. Праўда… я на яго падобная… Гэта наша з ім сувязь. Бацька ажаніўся на прыгожай сялянскай дзяўчыне. З беднай сям'і. Хацеў зрабіць з яе пані, а мама заўсёды насіла хустку, насунуўшы яе нізка-нізка на бровы. Не пані. У Сібіры бацька не доўга жыў з намі… ён сыйшоў да іншай жанчыны… А я ўжо нарадзілася… Я была пакараннем! Праклёнам! Ні ў каго не было сілаў любіць мяне. І ў мамы таксама не было гэтых сілаў. Гэта запраграмавалася ў маіх клетках: яе роспач, яе крыўда… і нялюбасць… Мне заўсёды бракуе любові, нават калі мяне любяць, я не веру, мне ўвесь час патрэбныя доказы. Знакі. Яны патрэбныя мне кожны дзень. Кожную хвіліну. Мяне цяжка кахаць… я ведаю… *(Доўга маўчыць.)* Я люблю свае ўспаміны… Люблю свае ўспаміны за тое, што там усе жывыя. У мяне там усё ёсць: мама… тата… Уладзя… Мне абавязкова трэба сядзець за доўгім сталом. З белым абрусам. Я жыву адна, але ў мяне на кухні стаіць вялікі стол. Можа, яны ўсе са мной… Я магу ісці — і раптам паўтару нечы жэст. Не мой… Уладзін жэст… ці мамчын… Мне здаецца, мы датыкаемся рукамі…

Я — у дзіцячым доме… У дзіцячым доме сіротаў-асаднікаў выхоўвалі да чатырнаццаці гадоў, а потым адпраўлялі на руднікі. І ў васямнаццаць гадоў — сухоты… як ва Уладзі… Гэта лёс. Дзесьці далёка, казала Уладзя, у нас ёсць дом. Але вельмі далёка. Там засталася цётка Марыля, мамчына сястра… Непісьменная сялянка. Яна хадзіла, прасіла. Чужыя людзі пісалі лісты. Не разумею і цяпер… ну як? Як яна дамаглася? У дзіцячы дом прыйшло распараджэнне: адправіць мяне разам з сястрою па вось такім адрасе.

У Беларусь. У першы раз да Мінска мы не даехалі, у Маскве нас ссадзілі з цягніка. Усё паўтарылася: Уладзю — у яе пачаўся жар — у лякарню, мяне — у ізалятар. З ізалятара — у прыёмнік-размеркавальнік. Сутарэнне, пахла хлоркай. Чужыя людзі…

Я ўвесь час жыву сярод чужых людзей… Усё жыццё. А цётка пісала… пісала… Праз паўгода знайшла мяне ў тым прыёмніку. Ізноў я чую словы «дом», «цётка»… Мяне вядуць да цягніка… Цёмны вагон, толькі асветлены праход. Цені людзей. Са мной — выхавальніца. Даехалі да Мінска і ўзялі квіток у Паставы… я ўсе гэтыя назвы ведаю… Уладзя прасіла: «Ты запамінай. Запомні: наш маёнтак Соўчына». З Пастаў ідзём пешшу ў Грыдзькі… у цётчыну вёску… Селі каля моста перадыхнуць. А тым часам сусед ехаў з начной змены на ровары. Спытаў, хто мы. Адказалі, што прыехалі да цёткі Марылі. «Так, — сказаў ён, — правільна ідзяце». І, відаць, перадаў цётцы, што бачыў нас… яна пабегла насустрач… Я ўбачыла яе і кажу: «А вось гэта цётка падобная на маю маму». І ўсё.

Стрыжаная «пад нулёўку», сяджу на доўгай лаве ў хаце дзядзькі Стаха, мамчынага брата. Дзверы адкрытыя, і праз праём відаць, што людзі ідуць і ідуць… спыняюцца і моўчкі глядзяць на мяне… Жывапіс поўны! Ніхто адзін з адным не размаўляе. Стаяць і плачуць. Абсалютная цішыня. Уся вёска прыйшла… І яны перакрылі мой струмень слёз, кожны плакаў са мной. Усе яны ведалі бацьку, хтосьці ў яго працаваў. Не раз я потым пачую: «У калгасе нам «палачкі» налічваюць, а Антэк (бацька) заўсёды разлічваўся». Вось яно — мая спадчына.

Нашу хату перавезлі з хутара на цэнтральную сядзібу калгаса, у ёй дагэтуль сельсавет. Я ўсё ведаю пра людзей, ведаю больш, чым хацелася б. У той жа дзень, калі чырвонаармейцы пагрузілі нашу сям'ю на калёсы і павезлі на станцыю, тыя ж людзі… цётка Ажбета… Юззфа… дзядзька Мацей… разнеслі з нашай хаты ўсё па сваіх хатах. Дробныя пабудовы разабралі. Раскацілі па бярвенцы.


Фота В.К.

І малады сад выкапалі. Яблынькі. Цётка прыбегла… і панесла толькі вазон з акна на памяць… Не хачу я гэта памятаць. Ганю з памяці. Я памятаю, як вёска мяне няньчыла, насіла на руках. «Ідзём, Манечка, да нас, мы грыбоў наварылі…», «Давай малачка табе налью…». Сёння я прыехала, а назаўтра ў мяне ўвесь твар пакрыўся пухірамі. Пякло вочы. Не магла падняць павекі. Мяне за рукі вадзілі мыцца. У мяне выбольвала ўсё, выпальвалася, каб я паглядзела на свет іншымі вачыма. Гэта быў пераход з таго жыцця да гэтага… Цяпер я ішла па вуліцы, і мяне кожны спыняў: «Якая дзяўчынка! Ай, якая дзяўчынка!». Без гэтых слоў у мяне вочы былі б як у сабакі, якога выцягнулі з палонкі. Я не ведаю, як я глядзела б на людзей…

Жылі цётка з дзядзькам у каморцы. Хата ў вайну згарэла. Паставілі каморку, думалі, на першыя часы, і там засталіся. Саламяны дах, маленькае акенца. У адным куце бульбачка (цётчыны словы) — не «бульба», а «бульбачка», а ў іншым — парася віскоча. Ніякіх дошак на падлозе — зямля накрыта аерам і саломай. Хутка сюды ж прывезлі Уладзю. Пажыла яна трохі і памерла. Цешылася, што паміраe дома. Апошнія яе словы: «А што будзе з Манькай?»

Усё, што я даведалася пра любоў, я ведаю з цётчынай каморкі…

«Мая ты птушачка… — звала мяне цётка. — Мая жужалка… пчолка…». Я ўвесь час лапатала, цэрабіла яе. Я не магла паверыць… Мяне любілі! Любілі! Ты расцеш, а табой любуюцца — гэта такая раскоша. У цябе ўсе костачкі распростваюцца, усе цягліцы. Я танчыла ёй «рускага» і «яблочко». Мяне навучылі гэтым танцам у ссылцы… Спявала песні… «Есть по Чуйскому тракту дорога. / Много ездит по ней шоферов…», «Умру, в чужой земле зароют, / Заплачет мамочка моя, / Жена найдет себе другого, / А мать сыночка — никогда…». Набегаешся за дзень так, што ногі ўсе сінія-сінія, абадраныя — абутку ж не было ніякага. Ляжаш увечар спаць, а цётка твае ножкі закруціць у падол сваёй начной кашулі, сагрэе. Яна мяне спавівала. Ляжыш дзесьці каля жывата… як ва ўтробе… Таму я не памятаю зла… Я на зло забылася… дзесьці далёка яно ў мяне схавана… Раніцай прачыналася ад цётчынага голасу: «Я дранікі спякла. Паеш». — «Цётка, я спаць хачу». — «А ты паеш і спі». Яна разумела, што ежа… бліны… для мяне як лекі. Бліны і любоў. А дзядзька наш Віталік быў пастух, насіў на плячы пугу і доўгую берасцяную дудку. Хадзіў у ваенным кіцелі і галіфэ. Прыносіў нам з пашы «торбу» — там і сыр, і кавалачак сала — усё тое, чым яго частавалі гаспадыні. Святая бедната! Яна для іх нічога не значыла, не крыўдзіла, не абражала. Як для мяне важна ўсё гэта… каштоўна… Адна сяброўка жаліцца: «Няма грошай на новую машыну…», іншая: «Усё жыццё марыла, а так і не купіла сабе норковае футра…». Як праз шкло чую… Адзінае, пра што я шкадую, што не магу ўжо насіць кароткую спадніцу… *(Разам смяёмся.)*

У цёткі быў незвычайны голас… дрыготкі, як у Эдзіт Піяф… Яе звалі спяваць на вяселлях. І калі хтосьці паміраў. Я заўсёды з ёй… побач бягу… Памятаю… Вось яна стаіць-стаіць каля труны… доўга стаіць… У нейкі момант адлучаецца неяк ад усіх, падыходзіць бліжэй. Павольна падыходзіць… яна бачыць, што ніхто не можа сказаць гэтаму чалавеку апошніх слоў. Людзі хочуць, але не ўсе ўмеюць. І вось яна пачынае: «І куды ты, Анечка, ад нас пайшла… светлы дзень і ночку пакінула… хто цяпер будзе хадзіць па тваім двары… хто дзетак тваіх пацалуе… хто ўвечары кароўку сустрэне…». Ціха-ціха падбірае словы… Усё побытавае, простае, і яно ж высокае. Сумнае. Нейкая самая апошняя праўда ў гэтым простым. Канчатковая. Голас дрыжыць… І ўсе за ёй пачынаюць плакаць. Ужо забыта, што карова не падоена, муж п'яны дома застаўся. Змяняюцца твары, сыходзіць мітусня, на тварах праступае святло. Усе плачуць. Я саромеюся… і шкадую цётку… Вернецца яна дахаты хворая: «Ой, Манечка, галоўка шуміць». Але такое было ў цёткі сэрца… Са школы прыбягу… Маленькае акенца, іголка з палец… Цётка зашывае нашыя анучкі і спявае: «Агонь зальеш вадою, / Каханне ж анічым…». Я азорана гэтымі ўспамінамі…

Ад нашага маёнтка… Ад нашай хаты засталіся адны камяні. Але я чую іхняе цяпло, мяне цягне да іх. Прыязджаю туды, як на магілу. Я магу там заначаваць у полі. Хаджу асцярожна, баюся ступіць. Чалавека няма, а жыццё ёсць. Гул жыцця… розных жывых істотаў… Хаджу і баюся разбурыць нечы дом. Я і сама магу ўладкавацца дзе заўгодна, як мурашка. У мяне культ дома. Каб раслі кветкі… было хораша… Я памятаю, як у дзіцячым доме мяне вядуць у мой пакой, дзе я буду жыць. Белыя ложкі… Шукаю вачыма: ці не заняты ложак ля вакна? Ці будзе ў мяне свая тумбачка? Я шукаю, дзе будзе мой дом.

Цяпер… Колькі гэта мы сядзім і гаворым? За гэты час адгрымела навальніца… суседка прыходзіла… тэлефон званіў… Усё гэта ўплывала на мяне, на ўсё гэта я адгукалася. А на паперы застануцца толькі словы… Іншага нічога не будзе: суседкі не будзе, тэлефонных званкоў… таго, што я не сказала, але яно мільгала ў памяці, прысутнічала. Заўтра наогул я аб усім, можа быць, распавяду інакш. Словы засталіся, а я ўстану і пайду далей. Я навучылася з гэтым жыць. Умею. Іду і іду.

Хто гэта мне даў? Усё гэта… Бог даў ці людзі? Калі Бог даў, то ён ведаў, каму даваць. Пакута мяне выгадавала… Гэта мая творчасць… Мая малітва. Колькі разоў я хацела каму-небудзь усё распавесці. Прагаворвала. Але ніхто мяне ні разу не спытаў: «А далей што… далей?». А я ўвесь час чакала добрых ці дрэнных людзей, не ведаю, але ўвесь час чакала людзей. Усё жыццё чакаю, што мяне хтосьці знойдзе. І я ўсё яму распавяду… і ён спытае: «Ну, а далей што?».

Цяпер пачалі казаць: сацыялізм вінаваты… Сталін… Як быццам у Сталіна была ўлада, як у Бога.

У кожнага быў свой Бог. Чаму ён маўчаў? Мая цётка… наша вёска…

Я памятаю яшчэ Марыю Пятроўну Арыставу, заслужаную настаўніцу, якая наведвала нашу Уладзю ў бальніцы ў Маскве. Чужая жанчына… яна і прывезла яе да нас у вёску, унесла на руках… Уладзя ўжо зусім не хадзіла… Марыя Пятроўна дасылала мне алоўкі, цукеркі. Пісала лісты.

А ў дзіцячым прыёмніку-размеркавальніку, дзе мяне мылі, дэзінфікавалі… Я на высокай лаве… уся ў пене… магу саслізнуць, разбіцца аб цэмент. Слізгаю… спаўзаю… Чужая жанчына… нянька… падхоплівае мяне і прыціскае да сябе: «Маё ты птушанятка».

Я бачыла Бога.

Пераклад з расійскай мовы.

ПАЭМА

ПРАЗОРЦА

Васіль МАКАРЭВІЧ

Светлай памяці
ВАСІЛЯ БЫКАВА

1
Не слухаў ён
Ні гімнаў, ні канцон.
А днямі без адхлання і прадухі,
Мо тысячу, не меней, верацён
Круціў перад сабой,
Як папрадуха.

І на здзіўленне
Шчыруноў-ткачоў
На іх ён вёў не залатую нітку,
А чэргі кулямётных станкачоў
І трасы залпаў кожнае
Зеніткі.

На кроснах,
Што з мярэжамі нітоў, —
У шынялі, на ветры парыжэлым,
Ткаў рупна бёрдам агнявых франтоў
Палотны перамог
І паражэнняў.

Хоць час кідаў
Каменні ды глыжы,
Заносіў сцежкі жвірам і снягамі,
А вёрсты ўсцяж, нібыта панажы,
Уверх-уніз хадзілі
Пад нагамі.

Яснеў абсяг,
Ярчэй рабіўся зрок.
Душу, здаецца, працінала токам.
І востраў думкі точаны чаўнок
Мільгаў у кроснах з ніткаю
Утоку.

Ён добра знаў,
Што не адзін быў ткач.
Іх меліся брыгадныя арцелі.
Дзяругі ткаў ля партача партач,
Як за сцяной крамлёўскаю
Хацелі.

А ён не раз
Біў у сцяну плячом,
Пратэставаў наўмысна, а не здуру.
Бо не жадаў прыдворным стаць ткачом,
Прадажным трубачом
І трубадурам.

З размахам
Грозных франтавых атак,
Не тых, што са штабной аранжарэі,
Ён бёрдам грукатаў і гракаў так,
Аж недзе Віслы берагі
Дрыжэлі!

І не хацеў
І хвілі нават быць
У тым аркестры, што зрабілі зводным.
Ды ў барабан, як доўбняй,ззаўха біць
І ў ім лічыцца радавым
Ці ўзводным.

Ён пасміхаўся
З млына, што малоў

Васіль Быкаў. ХХ стагоддзе

І так грымеў, нібыта ў апраметнай,
Не пад Масквой, а на Зямлі Малой
На кон стаўляўся лёс
Другой сусветнай.

Хоць гул баёў
Даўно ўжо ацішэў,
І мірна дні па ўсёй зямлі ступалі,
З яго акопаў дымных і траншэй
Вайны святая праўда
Праступала.

2
Былы
Артылерыст і бамбардзір,
Магчыма, у імя святой «Пагоні»
З вайны ён генеральскі зняў мундзір
І маршальскія ўслед састрыг
Пагоны.

Брахні і звад
Акружаны кальцом, —
Штабістаў, з іх капрызнай панароўкай,
Ён распранаў не толькі да кальсон, —
Куды глыбей штабной
Татуіроўкі.

І з жонак іх
Паходна-палявых,
Якіх больш трэслі звады, а не ўхабы,
Зрываў ён німб герояў франтавых
З пластамі парфюмерыі
Пахабнай.

Хіба ён мог
Хаця б на міг забыць,
Як штабнікам загадвалі іх феі,
Які квартал у горадзе адбіць,
Якія трэба ўзяць для іх
Трафеі!

Ды ці маглі
Кастраты-бабылі
Аж да світання церабіць капусту?!
Адно што рады з локцямі былі
На грудзі кралі ўзлезці,
Як на бруствер.

Калі ён, вораг,
З кулямётаў сек
І бомбамі зямлю вярнуў дый тузаў, —
Хутчэй хавалі не шматвёрстку ў сейф,
А прасталыткі ліфчык
Ці рэйтузы.

І так заўсёды,
Кожны раз было, —
За ўзяты горад, Кенігсберг ці Прагу, —
Для пехацінцаў — медаля бяльмо,
А дзеля краляў — ордэн
За адвагу!..

Не мог зыбыць
Ён памяццю байца,
Што, адступіўшы аж да Сталінграда,
Апорай цвёрдай апасля Данца
Для штабнікоў былі
Заградатрады!

Як за глухой
Каменнаю сцяной,
Яны зацята, з пільнасцю сычынай,
Сядзелі ў пехацінцаў за спіной,
За кожным рухам у прыцэл
Сачылі.

З душой звярынай,
Што ў густой паўсці, —
Хоць плямы у байцоў ірдзелі бантам,
Гвардзейцам не давалі адпаўзці
Да блізкага ратунку —
Медсанбата!

Бы ў змове з тымі,
Хто да Волгі лез, —
У вогненным задушшы, як у пекле,
Байцоў у клешчы бралі і, як лес,
Валілі долу, з кулямётаў
Секлі…

Ў дзень Перамогі
З гуртам дружбакоў
Не мог трываць — пякла сляза сухая! —
Што першымі ў радах франтавікоў
Цераз паўвека чэшуць
Вертухаі.

На кожным
Ардэноў іканастас
Свяціўся так надраены да бляску,
Што ззянне залатое кожны раз
Сляпіла дзесь Курылы
І Аляску…

Дарма генштаб
Рыкаў, бы люты дог,
Пад ногі злыдні валуны кацілі, —
Ён радавым упарта сплачваў доўг,
Што цыркачы штабныя
Не сплацілі.

Каб па зямлі
На захад слаўся мост,
Хоць воіны ў баях геройскі палі,
Яны ў зямлі стаялі навырост,
Нібы пяском засыпаныя
Палі.

Не знаўся
З бухгалтэрыяй двайной,
Дармо, што ўсюды цiснулі й давілі.
Вайна была дзеля яго вайной,
А не сцэнічным фарсам-
Вадэвілем!

У сэрцы нёс
Ён не адзін пісяг
І не шукаў адхлання і ў зацішку.
З акопа бачыў франтавы абсяг,
Нібы з паднебнай каланчы
Ці вышкі.

Палеглых
Памінаў ён без куцці
І не глядзеў у нетры гараскопа.
Гарматку нёс з байцамі, то кацiў
Цераз вайной разрытую Еўропу.

3
Ад века
Ні на крок не адставаў,
Хоць бавіўся падчас і за фуршэтам.
Ды вусача ў Крамлі ён даставаў
Не толькі мімаходзь
І рыкашэтам.

Не мог цярпець
Фальшывай дураты
І казак, што жывуць і па сягоння, —
Бы ўсе, як ёсць, грымотныя франты
Прайшлі праз кабінет
І стол ягоны.

Які з яго
Быў тактык і стратэг,
Калі шашой Калужскай ці Кашырскай
У першы дзень вайны з Крамля ён збег,
На дачы дзесьці у закут
Зашыўся?!

Ды ўсё ж яго
Паплечнікі знайшлі,
Па нейкіх там прыкметах апаролі,
Каб за сталом сядзеў зноў у Крамлі
На тым жа месцы, ды у новай
Ролі!

А сам пасля
Не горш, чым пракурор,
Прывыкшы да хвалы і да авацый,
Хоць першы у Крамлі быў панікёр,
У панікёрстве іншых
Вінаваціў.

З генштаба
Мог наладзіць балаган.
Бо так, як у падполлі прывучылі,
У сто нітоў снаваў, як інтрыган,
Ды ткаў ён звад густую
Павучыну.

На зайздрасць
Лордаў — лонданскіх сычоў —
Ён за сталом у спрэчцы, як запарцы,
Трукач з усіх адменных трукачоў,
Сто Чэрчыляў абвесці мог
Ля пальца.

Хоць кожны дзень
Генштаб мудрэў, сталеў, —
А з позіркам, куды вастрэй ад брытвы,
На тым бліщчастым, як плато, стале
Лёс вырашаў ён кожнай
Новай бітвы!

Семінарыст,
Бязбожны абібок,
Дзеля якога не было закона,
Стаў для дзяржавы не бажок, а Бог.
Ну а партрэт напісаны —
Іконай!

Як чорт, хіцёр,
На слова быў васцёр.
Ды там, дзе ў бітву ён падчас улезе, —
Ў кацёл траплялі войскі, бы ў касцёр,
Ад танкаў заставаўся хлам
З жалезам.

Чуў ці не чуў,
Як дзесьці бор куваў.
Бо кожны міг, без сну і без адхлання,
Дзень Перамогі на стале каваў
Нібыта на грымотнай
Накавальні.

На ім ляжалі
З копаццю снягі
І рваны дол, што на марозе выстыў.
Як быццам грознай Курскае дугі
У стол зацята упіраўся
Выступ.

Было, што часам
Аж з-за сотні вёрст,
Апальваючы дрэў густое голле,
Ляцелі з віскам да яго наўпрост
Агрызкі сталі і брані
З вуголлем.

Ды хто забыў,
Калі наўзбоч застаў
Граніцу вораг неўспадзеў уздыбіў,
Ён, гэты стол, для невіноўных стаў
Бязлітаснаю шыбельняй
І дыбай.
І глуха гуў,

Бы карабельны верф, —
За ім да рання седзячы нядарма,
Маглі ўзляцець да маршала уверх
І ўпасці да сяржанта
Камандармы.

З-пад кулака
Друз сыпаўся, то лом,
Палохаючы ўвесь генштаб дачыста.
Ах колькі іх было за тым сталом
Учынена, і здзекаў
І злачынства!

А стол-глушэц
Зважаў і не зважаў,
Бы ў змове з цішынёю быў келейнай.
Ды пад цяжарам грузнуў і ўязджаў
У звады ды інтрыгі
Па калена.

…Ах, колькі раз
Пасля пустых прамоў,
Каб ведзьмака душа пайшла у пяткі,
Ён, франтавік, наводкаю прамой
Гвазаў па тым стале
З саракапяткі.

4
Паўпраўды
Ненавідзеў ён эрзац.
Ці не таму цэкоўцы, нібы магі,
Падачкамі хацелі прывязаць
Да звэдзганай дзяржаўнай
Калымагі.

І ўпарта
Падступалі зноў і зноў, —
А мо на іхні лад залемантуе?
На грудзі ўзвеслі фуру ардэноў
І прышпілілі Зорку
Залатую!

А ён,
Нібы фарватэрам рачным,
Ішоў супроць цячэння, сілы воднай.
І дзеля ўлад слухмяным і ручным
І хвілі не зрабіўся
Аніводнай!

Калісьці сам,
Да грознае вайны,
Падаўся ў свет з нямога захалусця.
І больш, відаць, ад звадаў сатаны
Ён ненавідзеў здраду
І халуйства.

Хаця, шчырун,
З усімі ў смагу смаг
І мудраваў над скрыняю Пандоры,
Яго імя з цэкоўскіх хтось дзяляг
Пад звягаю крамлёўскай
Прышпандорыў.

Як быццам
Не прасіў — патрабаваў,
Каб за мяжу, без каліва вагання,
Франтавіка былога трыбунал
Турнуў, нібы злачынцу,
У выгнанне!..

Зямля і свет
Хадзілі хадуном,
Аж з неба пух ляцеў, нібы з пярыны.
І сам ён задыхаўся дзень за днём,
Нібы ў гарачым воблаку
Парыльні.

Ад духаты
Ішлі ў вачах кругі.
І, каб у ёй дарэшты не зварыцца,
Ён выраваўся ў фінляндскія снягі,
Нібыта з цеснай клеткі
Ці звярынца.

І ўдзячны,
Як брыльянту, ледзяшу
З сяброўкаю, зацятаю самотай,
Студзіў падоўгу сэрца і душу,
Зарыўшыся ў глыбокія
Сумёты.

Пасля, як дома,
З венічкам удвух
Спяшаўся бегма на палок у лазню.
Ды з цела выганяў паганы дух,
Нібы сектанта-трасуна
Ці блазна.



Васіль Быкаў. XXI стагоддзе


Вёска Бычкі. Парэшткі роднага падворка

Зіма ляжала
У лясной глушы,
І цішыня плыла з-за гарызонта.
А ён у сотнях вод змываў з душы
Абразу, звягу, горыч
І згрызоты.

Бы раскусіў
Ён мудрасці арэх,
Паверыўшы у франтавое брацтва.
І вылятаў у прадсвітальны снег
З парыльні-астматычкі
Навабранцам.

Ды кроіў зноў
Пласты жыцця, бы торф,
Пад блізкія ўскрыкі: «Віра», «Майна»!
Яго пазваў гасцінны Дзюсельдорф,
Каб жыць ён мог у Франкфурце-
На-Майне!

У новы век —
Інакшыя часы.
Сустрэчы з прымірэннем у кілішку,
Без вусцішнай нейтральнай паласы,
Франтавікоў і ворагаў
Калішніх.

І кожны,
Ветэран і афіцэр,
Глядзеў і мружыў вейкі вінавата,
Нібы ўзіраўся толькі што ў прыцэл
Артылерыйскай франтавой
Гарматы.

Ён баразну
І там вярнуў ды гнаў.
Вайны прарэхі безупынна латаў.
А век з вайной і за мяжой дагнаў,
Паклаў яго ў бальнічную
Палату.

5
Шапнуў ён
Празе залатой: «Бывай!» —
Падрэзаны хваробай, што пілою.
Хоць там і не павіннасць адбываў, —
Дадому вырываўся,
Як з палону.
Маленькі,

А злавесны, вузялок,
Якому й ведзьмакі не будуць рады,
Дармо што дзесь не глыбака залёг, —
Ды не далі яму хірургі
Рады.

Пакуль ён рыўся
Ў справах, бы ў пясках,
Не моўкнуў гул, нібы на пераправе:
Дамоў ці варта ўрэшце адпускаць?
На рызыку ніхто не мае
Права!

А — лекі?
І Нью-Ёрк і Галівуд —
У іх даляраў, як на звалцы смецця! —
Дастануць не таблетку — проста цуд,
Што гарантуе сто гадоў
Бяссмерця!

А што ён мог
Сказаць ім у адказ?
Хіба спяшаўся піць з уладай брагу? —
Зірне ён на Прыдзвінне толькі раз
І, як абруч, пакоціцца
У Прагу!

Рыпелі дзесь,
Аж вылі палазы,
І песня ў лад прасіла, як і трэба:
– Аэрадромшчык, друг, перавязі
На бок другі Еўропы
Цераз неба!

І, як ішло
З аддаўненых часін,
З адненькім пёркам і, амаль улегцы,
Вяртаўся ён дамоў, як верны сын,
Каб у зямлю бацькоў
Навекі легчы!

Не дзеля шыку
Вольны час знайшоў,
І, як падчас былых гадоў застойных,
Калішніх зноў сабраў таварышоў,
Наладзіў з добрай гаманой
Застолле.
Як быццам рысу
Пад жыццём падвёў,
Згадаўшы нейкі там наказ прабабчын.

А што з вяртаннем дружбакоў падвёў, —
Няхай пасля нябожчыку
Прабачаць!

Зняў летні дзень,
То зноў плыла імгла.
Каціўся быт па вызнанай калейцы, —
Сачылі пільна здані з-за вугла,
Каб часам ён не выкінуў
Каленца.

Хто ведаў,
Што уздрыгнуць і вежы,
Зайздроснікі прыцiхнуць пад брылямі,
Калі памчаць па кальцавой шашы
Яго на «хуткай» прама
Ў Бараўляны.

Адкрыў павекі —
Дактары наўкруг!
І ў міг апошні і жыцця і скону
Пабачыў ён, як скача цераз луг
Табун чырванагрывых
Пудкіх коней.

6
Пасля густых
Захлёбістых залеў,
Калі раскошна травіне і красцы, —
Нябожчыкаў такіх бы ў маўзалей,
А не ў пясок, і ў дамавіне,
Класці!

Хоць не сказаў
І ў тастаменце ён
Пра пахаванне, не зрабіў і коскі, —
Яго прыняў жалобны пантэон
У вечны спрат, каля шашы
Маскоўскай.

А лепшы друг,
Без джалістай пілы
І без рэкламнай хітрай буфанады,
Ў Фінляндыі сасватаў паўскалы,
І ў Мінск прывёз, як глыбу
Рафінада.

А дома,
Як заўсёды, нелады —
З ёй у сцяну упёрся і — ні з месца!
І не таму, што глыба на клады
Цераз вароты не магла
Пралезці.

За вокнамі
Цадзіліся дажджы,
І гул і тлум стаяў, як у прадзільні:
Чаму вось гэта глыба — з-за мяжы,
А не з узлесся ці палёў
Прыдзвіння?!

Ноч напралёт
У кабінетах соп
Даверáны сінкліт заканадаўцаў:
Мажліва, зноўку Захаду падкоп,
А ці хітрушчы дар пралаз
Данайцаў?

Мо трэба ім
Трывожна ў рэйку біць —
Ён, камень, з гор прывезены ці з ляда,
Сабой натурай рознай можа быць —
І стаць прамой пагрозаю
Для ўлады!

Заслала неба,
Пэўна, так імглой,
Ці легла ноч па-над зямлёй скразная, —
Сказаць канкрэтна, што дапамагло,
Ніхто дасюль не можа
І не знае.

Мяняючы
Не менеі сотні поз,
Падобны да калішніх балаголаў,
На край магілы камень сам дапоўз
І звесіў па-над ёю нізка
Голаў.

Дзень зіхаціць,
Шапоткі дождж імжыць,
Ці гром рване меч бліскавіцы з похваў, —
Глядзіце — тут, пад каменем, ляжыць
Не проста прах, а болей,
Чым эпоха!


2005, 2013 гг.

АПОВЕД

АКУЛЯРЫ А ЛЯ ДЖОН ЛЕНАН

Ігар СІДАРУК

Гэта былі звычайныя акуляры. Нават без шкельцаў. Карацей, такая звычайная металёвая аправа стандартнай формы а ля Джон Ленан. Пасуе яна далёка не ўсім, а мне дык увогуле была без патрэбы: паколькі заўсёды меў стопрацэнтовы зрок. Да ўсяго — без шкельцаў!..



Толькі мае субяседнікі, відаць, думалі крыху інакш. Таму білі подла, адмашыста, з адчаёвым гаканнем завяршаючы кожны бязжальны ўдар, — нібы прыпячатвалі мяне да халоднай цаглянай сцяны. Праўда, біць пачалі не адразу. А толькі пасля таго, як я начыста адмовіўся начапіць гэтыя акуляры, каб, значыць, бачыць усё навокал у нязменным і радасным светлагранні. Спачатку я ніяк не мог уцяміць, што гэта значыць. Потым смяяўся, потым злаваўся, аж нарэшце пакуль не выказаў усё, што я думаю і пра іх, і пра радаснае светлагранне, і пра металёвыя акуляры стандартнай формы а ля Джон Ленан.

Вось тут, можна сказаць, усё і пачалося. Спачатку яны білі мяне моўчкі. Потым прывялі ў належны стан, такі начапілі сілаю акуляры на пераноссе і ўжо пачалі біць, прыгаворваючы ды пераконваючы мяне ў тым, што карцінка навокал рэзка змяняецца ў лепшы бок і мне толькі варта прызвычаіцца да крыху нязвыклага напачатку ракурсу гледжання.

І, ведаеце, я нават спрабаваў гэта зрабіць. То жмурыў, то шырока расплюшчваў вочы. То скошваў іх, то зводзіў позірк на пераноссі. Аднак дарэмна. Упарта бачылася адно і тое ж: абшэрхлыя, вільготныя сцены з чорнымі праплешынамі, укормленыя, налітыя барвіннем морды маіх суразмоўцаў — і недзе за закратаваным акном — апошнія рэшткі назаўсёды знікаючага блакіту.

— Ну, што бачыш? Цяпер нармальна?! — гырчаў, пырскаючы пеністай слінаю, іх старшой. — Радасці — болей?!

— У халоднай труне бачыў я вашу радасць, підары! — яшчэ маючы сілы агрызацца, я спрабаваў сарваць з сябе гэтыя пакарабачаныя, скрыўленыя акуляры. — Упіхніце сабе іх у сраку, казлы! Калі чорнае — гэта чорнае, а белае — дык гэта белае, і ніяк няйначай! З гаўна сабе дурняў ляпіце, а не з мяне! Бач, мурлоцтва эсэсаўскае! Бездакорны зрок яны тут у лёхах мардуюць!

Невядома, што раззлавала маіх акулярных практыкантаў болей — словы пра «эсэсаўскае мурлоцтва» ці намёк на далёка не цывілізаваныя сутарэнскія метады вядзення душэўнае размовы, — але на мяне раптам пасыпаліся ўдары такой сілы, што чэрап гатовы быў покнуць, а жменька выбітых зубоў захрумсцела пад рэштамі ацалелых.

Толькі і гэта быў яшчэ не канец і нават не сярэдзіна.

Калі я так-сяк разляпіў залітыя крывёю вочы і да мяне пацІху стала вяртацца прытомнасць, самы плюгавенькі з гэтай групы злосна падняў акуляры з падлогі ды проста ўвагнаў іх мне ў твар. Яшчэ б крыху ўбок — і металёвая дужка дакладна прабіла б мне вока.

— Ну што, як цяпер? Лепш бачыш? Паружавела табе?

Відаць, ён сам і блізка не разумеў двухсэнсоўнасць апошняй сваёй рэплікі: бо я навокал сапраўды ўжо нічога не бачыў, акрамя крывавага ружовага мроіска.

— А як... яшчэ болей пашарнела? — усё-такі здолеў вычавіць я бяззубым ротам.

— А як пачарнела, то мы табе зрок падправім! — наваліліся зноў на мяне дубаломы. — Ты будзеш бачыць рэчаіснасць як трэба! Ты будзеш яе любіць! Ты будзеш ёю ганарыцца і пра яе марыць!



Мы табе зрок падправім! — наваліліся зноў на мяне дубаломы. — Ты будзеш бачыць рэчаіснасць як трэба! Ты будзеш яе любіць! Ты будзеш ёю ганарыцца і пра яе марыць!

Калі я ўжо амаль не мог паварушыцца і акуляры зноў займалі ганаровае месца на збітым у страшэнна-барвовае месіва твары, мне раптам падалося... што свет і сапраўды... неяк няўлоўна змяніўся да лепшага... неяк папрыгажэў і стаў болей прыязным і адкрытым.

Пасля чарговага раўнда гаворкі, калі я ўжо валяўся, адкінуўшы голаў, на падлозе, а па маёй аголенай спіне ходырам хадзіла нешта цвёрдае... ці сталёвыя пруты, ці то хакейныя клюшкі... свет раптам адкрыўся для мяне сваімі радаснымі і празрыста-дзіўнымі бакамі яшчэ болей, а сонечныя промні так і наравілі заліць усё памяшканне, якое ўвачавідкі павялічылася ў сваіх аптымістычных памерах.

Потым... Потым я мала што памятаю. Адзінае што, калі боль быў проста дзікім і для звычайнага арганізму ўжо невыносным, здаецца, я сам прасіў, каб мне як мага хутчэй начапілі на нос акуляры, і нават крычаў, каб ані не думалі іх здымаць пры чарговым сеансе татальна-ўзорнай апрацоўкі.

Бо ў акулярах было лягчэй. Бо ў акулярах можна было вытрываць тое, што звычайнаму чалавеку ў такіх умовах вытрываць немагчыма.

А яшчэ потым... Ужо не памятаю анічога. Усё патанула ў крывава-барвовай светла-цемры. Здаецца, пад канец я за нешта распісаўся на дзіўнай зеленаватай паперы... здаецца, у нагрудную кішэню кашулі мне ўвапхнулі нешта цвёрдае...

* * *

Калі я, хістаючыся, выйшаў на вуліцу, дык адразу міжволі заплюшчыў вочы. Тое, што я ўбачыў, было няправільным, шкодным, дрэнным і ўвогуле не сапраўдным. Гэта падман, так не бывае. Няўжо планета сыйшла з арбіты, і зямля зрушылася навокал?!

Рука ліхаманкава пацягнулася да кішэні на пярэднім баку кашулі, дзе ляжалі акуратна складзеныя металёвыя акуляры стандартнай формы а ля Джон Ленан. Так-сяк іх намацаўшы, выцягнуў, паднёс да твару, расправіў дужкі за вушамі й нарэшце расплюшчыў вочы. І ў тое ж імгненне канчаткова выразшыў, што не здыму іх болей ніколі. Свет навокал зноў быў гуллівым, адкрытым, перапоўненым вясёлкавым шчасцем — такім, якім павінен быць.

Я ўсміхнуўся і няспешна рушыў у натоўп.

А насустрач мне несканчальным патокам ішлі такія ж усмешлівыя людзі ў акулярах стандартнай формы а ля Джон Ленан без шкельцаў.

22.09.11
м. Кобрынь

ВЕРШЫ

ДЗЯЎЧЫНА БЕЗ ПАРАСОНА

Андрэй КОЗЕЛ

Адказы

Сонца чакае, калі наступіць дзень;
зоркі чакаюць надыходу ночы;
вецер пільнуе апалы ліст;
маланка вартуе першы гром;
неба ўпэўніваецца ў набліжэнні золку;
кветкі счакаліся чаканнем дажджу;
ваўкі спадзяюцца, што хутка поўня;
чалавек абнадзеены надыходам вясны;
адказы чакаюць сваіх пытанняў...

Сцены

Мы ўзводзім заводы,
каб лепей жылося;
мы кладзем дарогі —
трэба бачыць свет;
мы рамантуем машыны,
каб ехаць да сяброў;
мы абліцоўваем дамы,
каб цяплей жылося;
мы выкладаем дахі,
каб не баяцца дажджу;

але лепш за ўсё
мы будуем глухія сцены
адно ад аднаго.



* * *

Пад першай
красавіцкай залевай —
дзяўчына без парасона…
Неба здзіўляецца
тваёй смеласці;
усе глядзяць
табе ўслед;
а дождж — шле
свае апладысменты.

* * *

Снег. Сакавік.
Маразы. Завірухі.
Нехта Галоўны
згубіў каляндар.

* * *

Прыемна, мілагучна
рэжа слых
родная гаворка:
мова хворая?

* * *

Не хочацца быць
адным з нейкіх многіх —
хоць кімсьці для многіх
хацелася б стаць!

* * *

Як быццам
хоча надыхацца
апошнім паветрам
у адзіноце дзед
на зэдліку
познім адвячоркам.

Разбітыя мары

…І мары былі залатыя,
І гукі не рэзалі слых.
Мы думалі, што не такія,
Адрозныя мы ад усіх.

Ды зараз — гляджу ў твае вочы —
Не бачу чамусьці сябе.
А разам мы марылі крочыць,
І крочыць не так, як усе.

Канечне, мы не ідэальныя!
І хто б нас такімі зрабіў?
Хацелася быць унікальнымі,
Якім ніхто болей не быў.

А нашыя коні па крузе
Цягнулі карэту жыцця.
Па млечным кружылі мы лузе —
Цяпер гэта луг забыцця.

То залевы нам, то завеі.
Пойдзем — трэба рукі сагрэць! —
І там мы, здаецца, сустрэнем,
Тое, што не хацелі сустрэць.

Выходзіць — і мы з той жа скуры?
Цячэ ў нас звычайная кроў…
Жыццё мы малюем панурым —
Такіх дасягнулі высноў.

* * *

Два клёны пры полі
шэпчуць лістотай:
абдумваюць, што бачылі
за жыццё?


* * *

Вышэйшае за агароджу
стала дрэва:
таксама хоча
бачыць свет.

ВЕРШЫ

ЛОДКА КАХАННЯ

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ



Студзень

Больш каханай са мной не будзе,
хоць ты крычма крычы на свет!
Укруціў мяне жорстка студзень
у адчайны свой піруэт!

І панесла, ізноў панесла
лютым сіверам проста ў твар!
Ад халоднай студзеньскай песні
раптам страціў цярпення дар!

І пабег да цябе праз сцюжу,
праз злавесны студзеня смех!
Ты ж казала ў той вечар мужу:
«Закахацца ў другога — грэх!».

Ён таксама табе паверыў
і спакойна побач заснуў…
Ты ж цішком адчыніла дзверы —
і ў нікуды пад цішыню

зноў сыйшла, толькі цень дрыготкі
калыхнуўся — услед журбе,
быццам тая вольная котка —
пагуляць сама па сабе.

Муж прачнецца — цябе не ўбачыць,
у здзіўленні зірне ў акно:
безнадзейна ў начы гарачай
зразумее пра ўсё ізноў…

Ён цяпер, як і я, шукае
у світальнай студзеньскай мгле,
у халодных снягах без краю
твой няпэўны, як мроя, след!

Касцёр на снезе

Валерыю Гараўцову

Парваўшы восеньскі спакой,
зіма зноў смела
накрыла ўсе шляхі наўкол
вэлюмам белым.

Згубіўшы да жыцця любоў,
забыты светам,
ішоў я некуды ізноў
без пэўнай мэты.

Накрыў халодны белы рой
палеткаў соты,
і спадарожніцай маёй
была самота!

Хавала сцюжа бы знарок
нябёсаў просінь,
накрыў мяне — як пастка — змрок
жорсткага лёсу.

Няведама куды я йшоў
па яго волі,
сляды мае, бы тонкі шоў,
сшывалі поле.

Іх тут жа снежань замятаў
так ашалела,
што ўрэшце я ледзь сам не стаў
там беллю белай!

Сагнуў буран жорстка ў дугу
няўзнак мне плечы,
Ды ўбачыў раптам праз пургу
— гарыць агеньчык!

Ён цудам быў ў той старане
неверагодным!
Заззяў здалёк ён для мяне
Святой Паходняй!
Прабіць сцяну завеі змог,
бо меў знак веры!
Вакол сябе ён перамог
кавалак цемры!

Я разагнуўся ў поўны рост
з надзеяй новай,
і да яго пайшоў
наўпрост
з малітвы сло-
вам!

І ўбачыў я —
дамок ў бары
стаіць трывалы,
і побач з ім касцёр
гарыць
праз сцюжы
ярасць!

Шыбуе весела
агонь
амаль да неба!
Які дзівак развёў яго,
з якой патрэбы?

Я ля агню таго знайшоў
і хлеб, і чарку,
і зразумеў, касцёр нашто
гарыць тут ярка!

У змрочным нашым у жыцці,
святла дзе мала,
без перадыху ён свяціў
для заблукалых!

Быў маяком полымя знак
у іхным руху,
каб шлях знайсці было ім як
у завіруху.

Сагрэўся я, пакаштаваў
гасцінец шчодры,
і зноў далей пашыбаваў
у снежны морак.

І кляліся мае сляды
праз цалік ліха,
цяпер іх сцюжа не магла
ніяк засыпаць!

Касцёр той бы Рука Нябёс
мне запаліла,
і доўга шчэ ў сабе я нёс
ад яго сілу...

Лодка кахання

Ў чужой незнаёмай лодцы
плылі мы праз акіян...
Якім жа ён быў салодкім
твой трапяткі стан!

Якім жа ён быў ахвочым
да ласкі маіх рук!
Якімі ж былі твае вочы
што ўсю ўвабралі зару!

Якім жа ён быў кароткім
міг гэты, быццам уздых…
Але, напэўна, той лодцы
не ўтрымаць нас дваіх...

Пявуння

Я сустрэў цябе на Каляды,
ў Нараджэння Хрыстова дзень!
І як хлопчык малы, быў рады,
калі ты падарыла мне

ўсяго вечар адзін чароўны,
дзе былі мы толькі ўдваіх,
дзе не мог стаць табе я роўняй
і лавіў кожны твой уздых.

Ты здавалася мне то моцнай —
то праз міг — самай слабой,
лёгка ткаліся словаў кросны
пра нязводную нашу любоў.

Агарнула вачэй туманам
у той вечар новых дзівос,
і сустрэла са мною ранак
у расінках шчаслівых слёз.

І ўсю ноч сэрца абрывала
ты памкненнем кудысь сыйсці…
І спявала мне… Як спявала!
Мусіць,
як нікому ў жыцці!

Я пытаўся — куды імкнешся?
Ды адказу ўсё ж не пачуў…
Не заўважыў — як ты дарэшты
спаланіла маю душу!

А затым неспатольны горад
праглынуў цябе як у сне,
толькі водару твайго мора
доўга шчэ калыхала мяне.

Дзе ж ты зараз, мая пявуння?
Ў чый ты зноў увайшла давер?
Мне без песень тваіх сумных
немагчыма заснуць цяпер!

Дыстанцыя кахання

Мне адказалі Вы: «Яшчэ не час!»,
хоць ведама, жыццё — усплёск імгненны,
а я па ім, як па лязе, да Вас,
ішоў насустрач — толькі ўсё дарэмна!

«Яшчэ не час!» — зусім быў не прысуд,
а проста як адкладзеная цацка,
якая не каштоўнасць і не цуд,
і з ёй не шкода мімаходзь расстацца.

Я мала так паспеў прайсці да Вас
на лёсаносным жорсткім пераломе,
і прыпыніўся — бо «яшчэ не час»,
і ў небе мая зорка сціхла ў стоме.

І я пакуль для Вас зусім чужы
і непераадольна шчэ далёкі,
Бо Рубікона міг даўно пражыў...
А Вы? Вы ўся ў няўрымслівым палёце

за прывідам, што дзесьці па зямлі
адну Вас — найадметную — шукае...
А дні плывуць, як і раней плылі...
А час вадой ў пясок цішком сцякае...

Ды парадокс — адлегласць да Мяжы
у Вас, як і ў мяне — амаль такая ж...
Ды не ў гадах, што дасць нам Бог пражыць,
а — у імгненнях, вартых для кахання!

І ўсё ж пакуль адказ: «Яшчэ не час!»...
Хоць насамрэч бліжэй за ўсіх на свеце
пакутная мая душа цяпер да Вас,
і песні Вам мае спявае вецер.

Дык хто ж адкажа — ў колькі вёрст для нас,
у колькі дзён, гадоў і справаў розных
дыстанцыя паміж «Яшчэ не час!»
і завяршальна-незваротным «Позна?!»

УРЫВАК З РАМАНА

ПРЫТУЛА

Віктар БАРАНАЎ



Твае грамавыя словы, узмоцненыя мегафонам, ляцелі ў твары, сцягі, транспаранты і звыш усяго таго — далей над галовамі і сцягамі, у халодны, настоены на сталых зацятых маразах прыцемак начнога горада, б'ючыся і адбіваючыся рэхам ад сценаў і будынкаў, коцячыся па бруканках і асфальтах.

Ты стаяў на подыуме-ўзвышэнні, збітым з дошак незадоўга перад пачаткам мітынга пасярод плошчы, асвечанай імем святой Сафіі; разам з табою стаялі галоўныя дзеячы апазіцыі, перад вамі аж да самых пабудоў па перыметры плошчы тоўпілася зборышча — пасля першых вашых слоў ужо і не зборышча ці натоўп, а сіла людская, што верыла ў вас, а вы ў яе, і ад гэтага рабілася ўзаемна радасна, шчасліва, урачыста, быццам у храме; кожнае людское сэрца налівалася вераю, пэўнасцю, рашучасцю ісці за вамі, выразнікамі народнага гневу і патрэбы справядлівасці ды праўды. І не хацелася думаць, што праз які час, калі абязлюдзее плошча, кожны тут прысутны апынецца адзін на адзін з халодным вечарам і ўласным лёсам, нікому наогул не патрэбным і жалю вартым, як вартай жалю бывае саспелая галава сланечніка, сарваная са ствала і пазбаўленая свайго месца ў гурце іншых галоў на полі.

Ты яшчэ ўглядваўся ў гэтыя расчырванелыя твары, услухоўваўся ў напружанае, напоўненае моцай, гудзенне плошчы — гулі людскія сэрцы і камені пад нагамі, гуў купал нябеснай сферы, ты ўжо амаль гатовы быў ашчасліўіцца магчымым хуткім здзяйсненнем усёй вашай справы (з вамі ж во колькі народу, і якога народу — залатога, шчодрага, мудрага і свабодалюбнага!), але ў той жа час ты, даўно не наіўны рамантык, ужо адчуваў пад сэрцам зімнае вастрыё мінору. Бо ты ж добра ведаў, якія мы ёсць не ў гурце, не ў грамадзе, а з вока на вока з будзёншчынай, адзін на адзін з адвечнай думаю, што яе як не думай і перадумвай, а ўсё адно паверне на журбу і маркоту, і тады нікому няма клопату да яшчэ не схаладнелага пляцавага братэрства і яднання, аднадумства і рашучасці — тады кожны валтузіцца саматугам, і паняцце «народ» губляе сілу, а слова «натоўп» набывае сапраўды арыфметычнае значэнне, як мноства адзінак і не болей за тое.

Ты любіш гэтых людзей — і іх жа баішся. Яны са шчыраю вантробнаю радасцю ўспрынялі вас як правадыроў, зацята і ўпарта не ўяўляючы сябе ў гэтай ролі і ўсяляк адганяючы нават думку пра гэткае; яны палохаюцца такой думкі, песцячы ў генах сіндром вечна вядзёных, але такіх, якім прагнецца справядлівасці і якія здольныя марыць аб ёй з пакалення ў пакаленне, але толькі марыць — і ні на рух мезенца болей. Яны глядзяць на вас, галоўных апазіцыі, слухаюць вашыя ўзвіхраныя прамовы і хочуць чуць у іх тое, што разганяе ім застаялую кроў і абуджае з адвечнай звычнай дрымоты найтаемныя спадзяванні жыць у свеце справядлівым і жыць усім па праўдзе, аднак яны болей лічаць за лепшае хацець гэтага, чым нешта зрабіць дзеля гэтага ўласнаручна. Ім хочацца правадыроў, каб тыя ўзялі іх за натруджаныя парэпаныя рукі і пад сурмавыя маршы перавялі з плошчы ў райскі кут, створаны кімсьці іншым для кожнага з іх, дзе ўсяго ўдосталь і дзе правіцелі ў такіх жа дакладненька кутах на аднолькавых правах, лыжкаю з такога самага металу і такога самага памеру сёрбаюць гарачае варыва з аднаго на ўсіх катла. Ім патрэбны правадыр — іхні аднадумнік, здольны апусціцца да іхняга разумення агульнага дабра, да ўзроўню іхняга душэўнага болю, да іхняга інтэлекту — аднак не вышэй і не болей ні на ёту. Яны, млеючы знутры, аддаюць вам, кіраўнікам апазіцыі, сваё законнае права спытаць ва ўлады, калі ж нарэшце настане абяцанае «працвітанне»; ды калі вам не ўдасца дастукацца ў дзверы ўлады, або калі яна, добра ўсведамляючы, хто і ад імя якога народа стукаецца, не захоча адчыніць вам дзверы ці й наогул спусціць на вас цэрбераў з ланцугоў — вось тады не даруюць вам вашага бяссілля перад уладай: бяссілля, адзінаю і найпершаю прычынаю якога ёсць іхняя надзвычайная, тупая, закарэлая абыякавасць да ўласнага лёсу. О, народзе! — думаеш ты і сам не ведаеш, што трэба разумець пад тым народам. Ці ганарыцца ім, ці яго праклінаць.

Што ж гэта за люд найдзівосны, які не ведае і ведаць ужо не жадае сваіх продкаў, адсекшы памяць аб іх на трэцім (і не далей!) калене, а пад абрусам на адзіным у хаце стале хавае выпадкам зробленыя грошы: дык ты ж далей руку пад той абрус прасунь — а раптам знойдзеш там даўнюю метрыку і дакранешся да таямніц радаводу свайго, і адкрыецца табе адно з імёнаў дрэва, на адной з галінак якога выкалыханы і ты ў перадаванай у спадчыну калысцы, і табе, радасна агаломшанаму тым адкрыццём, прасцелецца сцежка да забытай, задзірванелай і закуставанай, ужо амаль нічыёй магілы, і ты пойдзеш на яе бязгучны голас, станеш над ледзь ацалелым грудком зямлі, і душа твая зазззяе ад нікому, апроч цябе, не чутнага голасу з-пад тоўшчы зямное, на покліч якога ты прыйшоў, і ты ўсвядоміш па-новаму, глыбінна і ўжо ніколі не забыўна, што на гэтай зямлі ты не ўзяўся ніадкуль, што ты тут не байструк гісторыі, што карані твайго роду вечныя ў часе і прасторы і што пакуль гучацьме табе той голас продкаўскі, датуль і зямля гэта, і свет гэты ў часе і прасторы ёсць твае, і нават хай цябе, народзе загадкавы, заб'юць і скуру здзяруць у каталажцы — ты ўсё адно застанешся тут вечна, бо ніхто цябе не заменіць, бо ніякія заменнікаў ні з якіх іншых земляў не ўспрымуць косткі тваіх продкаў, а голас іхні гудзецьме ў вушах прыхадняў, пакуль не давядзе іх да вар'яцтва.

Ты, народзе надзвычайны, за схаванымі для сябе заўтрашняга (але ад сябе сённяшняга!) некалькімі паперчынамі з партрэтамі гетманаў, не бачыш нічога іншага, апроч саміх партрэтаў; а там жа — «вывад правоў і вольнасцяў», і якраз правы на тыя вольнасці, занядбаныя з часам недалужнымі павадырамі ды тваёй валовай абыякавасцю (ідуць валы запыленым шляхам, капыты размерана-наканавана апускаюцца ў нагрэты пыл: пых! пых! пых! — уздымаюцца над капытамі клубікі пылу і зноў садзяцца на зямлю, вырачаныя на доўгае і пакорнае ляжанне; cinis et umbra sumus) і нахабна занядбаныя ад чужога да яшчэ больш чужога цара. Царскія знакі на тваёй зямлі яшчэ і цяпер ахоўваюцца законам суверэннай быццам бы дзяржавы, замест гэтага твае гетманы спачываюць (дзе там спачываюць — мардуюцца на тым свеце!) невядома дзе, па чужых краях, і хто і калі збярэ тое, што ад іх засталося, у адзіны ўкраінскі пантэон: тут вось Піліп Орлік, тут Іван Сірко, тут Мазэпа, за ім Канашэвіч-Сагайдачны, Дарашэнка адзін і Дарашэнка другі, Іван Выгоўскі, Багдан-Зіновій Хмяльніцкі, Калнышэўскі Пятро, Скарападскі Паўло… Розныя яны, не аднолькавыя роздумамі пра твой лёс, народзе, але ж думы іх былі пра цябе і Украіну.

Ідэя пантэона выштурхнула вас, на той час пакуль і не галоўных у апазіцыі, у Маскву. Тады яшчэ ўсесаюзны Крэмль займаўся харчовай праграмай і дамаляваннем «людскога твару» да даўно прасмярдзелага, забруджанага бальшавікамі сацыялізму, і на Кіеўскім вакзале Масквы вас нечакана сустрэла родная дыяспара ў выглядзе стыхійных базарных радоў уздоўж ходнікаў і гранітных парапетаў. Тут паўнакроўна раскашавала мова твайго люмпен-пралетарыяту, любоўна выпешчанага яшчэ «Вялікім Кастрычнікам»: семечкі, гаўядзіна, руб, дохтарська каўбаса, почкі, пічонка… Твая Украіна стаяла на маскоўскіх асфальтах як апошняя перакупшчыца, якая сваё ж і прадае за бесцань, ад рота ўласнага адарваўшы, а ў гэты час недзе ў палітычнай падваротні белакаменнай накормлены з вялікадзяржаўнай цыцкі вырадак разводзіў чарніла, якім праз год-другі напэцкае на кавалку фанеры лозунг і выйдзе з ім на Старую плошчу: «Ельцын! Заставь хохлов накормить Москву!». Каля Крэмля ты пачуеш замучаны голас ушчэнт абыякавага экскурсавода, які распавядае чарговай групе турыстаў пра Кутаф'ю вежу і не можа толкам растлумачыць, адкуль пайшла тая назва («Видите, она какая-то неуклюжая, отсюда и называется Кутафья»), аж табе захацелася крыкнуць ашуканым экскурсантам, што тая вежа кутняя, куткавая, таму так і завецца, а «неуклюжесть» ваша маскоўская — ад невуцтва і нежадання прызнаць, што і мова, і вера, і асвета з навукаю, і чароўныя спевы з непараўнальнай музыкай прыйшлі да вас з Кіева, з Украіны, якой вы з часам і адплацілі ад шчадротаў сваіх варварскіх. Ды нават назва народу вашага і краіны ўкрадзены ў нас, прыватызаваныя на вечныя времена.

Ды вам не да Масквы ў той час. Недзе там пад Валакаламскам, гэта дарогаю ўбок Смаленска, у Ярапольчым сяле, перакручаным у Ярополец, спачывае ад юдолі зямной Пятро Дарашэнка, з радавога гнязда якога — і прыгажуня Наталі Ганчарова, Пушкіна жонка і маці яго чатырох дачок. Вы доўга едзеце «Ікарусам», дадзеным украінскім таварыствам у Маскве «Славуціч» (сам старшыня таварыства Паўло Раманавіч удзяліў вам колькі хвілінаў для фуршэтных зносінаў, прыбыўшы на сустрэчу ў суправаджэнні з яшчэ адным земляком — намеснікам Рафіка Нішанавіча ў палацы ўсесаюзнага парламента, сябрам сям'і самога кампартыйнага памазаніка; на фуршэце той другі зямляк падыдзе да цябе з фужэрам мінеральнай і па-сяброўску даверліва наракацьме, што нейкая ўкраінская газета назвала яго проста паэтам, апусціўшы цяперашнія яго высокаслужбовыя тытулы, а гэта ж патрэбна не яму асабіста — дзеля прэстыжу Украіны патрэбна, а яны, пісакі-недарэкі, лапухамі вушы панакрывалі, і іх «не прашыб'ёш»), у дарозе цябе ўразяць нябачанай вышыні бярозы ў гушчары прышашэйнага лесу ды мілае шчабятанне жанчынкі-функцыянеркі са «Славуціча»: аж не верыцца, што можна дзесяцігоддзямі жыць у Маскве і зберагчы такое прыгожае, такое прыроднае ўкраінскае вымаўленне.

У Ярапольчым кіроўца без падказкі (пэўна, гэта яму не ўпершыню) кіруе да плошчы ў цэнтры сяла, вы самлелымі нагамі ступаеце на зямлю, у якой ляжыць вялікі ўкраінскі гетман, ашуканы, як і амаль усе гетманы, царом. У невялікай агароджы з металічных прэнтаў — камлыга калісьці белага, а цяпер ужо сшарэлага ад стагоддзяў вапняку, мечаная дажджамі, градам, зацятымі паўночнымі завірухамі і чыймісьці неразумнымі рукамі; вычаканеныя на ёй літары ўжо не чытаюцца; у адным з куткоў агароджы вольна раскашуе куст бэзу; сіняя фарба на прэнтах узялася аблупінамі. «Вось гэтак яны даглядаюць магілу гетмана?!» — хочацца табе закрычаць, але — да каго: апроч вас да гетмана нікому няма справы, дый чаму мела быць, калі чужы ён тутэйшым абарыгенам, а перад чужым чыё ж сэрца здрыганецца, вось паедзеце вы адсюль — выкалышацца бэзавае галлё ўвысь і ўшыркі, затуліць сабою і агароджу, і пашарэлы вапняк над касцьмі Пятра Дарашэнкі. Ярапольчае праймецца сваімі згрызотамі, вунь у сельмагу, драўлянай пабудове на высокім каменным падмурку, за нейкіх дваццаць метраў ад магілы, якраз «выкінулі» кансерваваную кільку ў тамаце, для сельскай глыбінкі — супердэфіцыт, і берагіні вашага гетмана, такія саменькія жанчынкі і бабулькі, як і ва ўкраінскіх сёлах, у такіх звычных твайму воку і аж родных кухваечках, прыступам бяруць магазін і з часам задаволіўшы свае матэрыяльныя патрэбы сеткаю кансерваў, ад няма чаго рабіць (і чаго яны ўсё прыязджаюць да тае камянюкі!) падыходзяць да вашага гурта. Кабзар сама спявае «Повіяв вітер степовий …», разносіцца нязвычны для абарыгеннага вуха перазвон струнаў бандуры, бабулі стаяць воддаль адасобленым гуртком, і на старэчых, збрыджаных векавым выгляданнем лепшае долі абліччах выразна прачытваецца запытальнае здзіўленне: няўжо недзе ў свеце людзі гавораць не так, як яны? Ох уж эти хохлы: вечно им неймется.

Гэтую фразу ты пачуў бы, нават калі б напіхаў у вушы ваты. Кінутая зноў жа такі ад нечага рабіць, яна ўгрызлася ў цябе, уелася кляшчом, пякла цябе ўсю дарогу да Масквы і ад яе да ўкраінскай, дагэтуль не існуючай мяжы, яна даймала цябе тым балючай, што моўлена была не палітыканам-шавіністам, не зацятым вялікадзяржаўніцкім ротам, не падазроным перабежчыкам-маларосам — яе спакойна, бясколерна, незласліва і менавіта праз гэта страшна для тваёй украінскай сутнасці прашамкацелі губы падмаскоўнай бабулькі ў задрыпанай кухваечцы, праз рукаў якой звісае сетка, поўная дэфіцытнага ў гэтых краях далікатэсу — кансерваванай кількі ў тамаце, па трыццаць сем капеек за бляшаначку, на якую ва ўкраінскім сяльмагу ніхто і вокам не маргне, за путны харч не лічачы.

Ты вяртацьмешся з Масквы і зажыўляцьмеш прычыненую рану шчымлівым суцяшэннем, што твой народ — не такі, што ён і гасцінны, і міласэрны, і да іншаземцаў цярпіма-талерантны (хоць, можа, не кожны дзядзька і чуў такое слова), а што песень незлічонаю процьму ўжо навыспеўваў сабе і ўсяму свету! — дзе яшчэ знойдзеш такі практычна ідэальны народ.

Дык чаму ж ты яго баішся, чаму пачуваеш сябе амаль самотным ваўком сярод гэтай шматлюднай плошчы, чаму пад сэрцам угняздзіўся холад не ад прымарожанай вячэрняй часіны, а ад незразумелага неспакою за ўсю вашую справу, у якую ты і сам часам верыш небезаглядна, бо ж не ўзяўся зніадкуль той халодны скавыш, што выстуджвае спярша думку, а далей і душу.

І ў тваёй памяці сплывае майскі Канеў, міжнароднае Шаўчэнкаўскае свята; вы, яго афіцыйныя ўдзельнікі (складзены адпаведныя імянныя спісы), падымаецеся прыступкамі на Чарнечую гару, кожнаму загадана прышпіліць на віднаце бірку-візітку (нехта сказаў пра яе «пэйджык», гэта ад англійскага «page» — старонка, аркушык, але хіба няма ўкраінскага адпаведніка?) з эмблемай свята і прозвішчам удзельніка, і па той бірцы вас, быццам авечак да кашары, прапускаюць шчыльныя міліцэйскія кардоны, і хтосьці з іхняга начальніцкага рангу, нягледзечы на прысутнасць замежных гасцей, перадае па рацыі сваім шматлікім падначаленым уздоўж усяго шляху на Гару па ўсходах: «Отсекай лишних! Лишних отсекай!..». Лішнія — гэта па-святочнаму ўбраны люд каля падножжа Гары, яму не положено ісці на самую Гару да магілы Прарока, бо там чакаецца прыезд Прэзідэнта; для іх, тых, што без «пэйджыкаў», але ў разнастайных нацыянальных строях, у святасць якіх яны яшчэ надзіва не зняверыліся, панатулена ўнізе на

прасторных травяністых палянах усяляких палатак, стылізаваных карчомак, проста немудрагелістых «забягайлавак», у якіх шараварна прыбраныя расійскамоўныя гандляркі запрашаюць выпіць гарэлачкі і закусіць чым Гасподзь паслаў.

Ты азіраешся на таго, хто перыядычна і адкрыта вымагае «отсекать лишних», і дзівішся: не, быццам бы і не падобны ён на прысланага з Маскоўшчыны міліцыянта, свой такі, дамарослы, хара твару выдае яго гарантаваную дамарослаcць, але — маларос ад форменных чаравікаў сорак чацвёртага памеру да кукарды на картузе.

Калі вы, мечаныя біркамі ўдзельнікі свята, падняліся на Чарнечую, а з нейкага часу Тарасаву, гару, Прэзідэнт паспеў ужо тут пабываць, яго з'яўленне адфільмавалі наспех для паказу ў вячэрніх тэленавінах, і гарант хапатліва адбыў для далейшага вырашэння спраў дзяржаўнай вагі; сапраўды, не будзе ж ён, абцяжараны лёсаноснаю харызмаю, чакаць, пакуль «отсекут лишних» і вы, таўраваныя «пэйджыкамі», пераадолееце нарэшце прыступкі да магілы Генія.

Вы мелі яшчэ адну нагоду сустрэцца з Прэзідэнтам — на адкрыцці помніка Шаўчэнку ў Корсуні, куды вы ехалі двума аўтобусамі, але на нейкім кіламетры між Каневам і Корсунем вашыя аўтобусы загоняць на палявы прасёлак, адкуль вы назірацьмеце, як трасай на шалёнай хуткасці прахурчыць прэзідэнтскі картэж — ты налічыш каля двух дзясяткаў іншамарак, і з якойсьці з іх памахае ў ваш бок гарант. Праз хвілінаў дзесяць вам дадуць дазвол на працяг руху; прыбыўшы ў Корсунь, вы застанеце самотныя мікрафоны, падобныя на адзінкавыя сланечнікі з адсечанымі галовамі, каля ўжо адкрытага помніка, і люд, які збіралі ў гонар прыбыцця першай дзяржаўнай асобы, разыдзецца.

Яшчэ на Чарнечай гары вам разане прамова тагачаснага спікера, яго «новае слова» ў Шаўчэнказнаўстве («Тарас схіляўся перад Пушкіным»); асабліва шакуе прысутных фраза прамоўцы (нехта ж з памочнікаў тую прамову пісаў!) «мастак Мікешэвіч маляваў Кабзара на смертнай лоджыі» — ты зафіксуеш яе дыктафонам, падасі ва ўласнай газетнай публікацыі і доўга не сцірацьмеш запіс на выпадак апратэставання спікерам тваіго на яго «паклёпу».

І вось гэта твой народ? Чым жа яго вусны больш дабратворныя за шамкаючы рот старой бабы з падмаскоўнага Ярапольчага? І гэта дзеля яго, такога народа, ты аддаў сябе на алтар вашае справы?

Але ты ўжо не здольны састyпіць са сцежкі, якою пройдзены добры кавалак жыцця. Ты ўжо не рамантык, ды нешта не дае табе кінуцца зняверы ў абдымкі, ёсць жа сярод іх у гэтым натоўпе светлыя галовы — акадэмікі, пісьменнікі, настаўнікі, духавенства; гэтыя ж павінны быць з вамі ад пачатку і да канца, так ім Госпадам прызначана. Павінны! Ды пакуль што — не настолькі, каб вам разам адчуць сябе сілаю, здольнаю выйграць паядынак з уладаю.

Перадвячэрні мароз усё мацнее, а ў цябе чамусьці ўсплывае ў памяці дысанансам да загуслага халоднага вечара забытая жнівеньская субота — дзень адкрыцця палявання на птушыную дзічыну. Ты ніколі не быў паляўнічым і ніколі ўжо ім не будзеш; на паляванне цябе завабіў твой аднакурснік-палтавец, весялун і непапраўны аптыміст, майстар бясконцых апавяданак на абы-якую тэму (у студэнцкія гады вы называлі Міколу артыстам арыгінальна-брахлівага жанру). Мюнхгаўзэн мясцовага маштабу, у чыіх вуснах, калі мова заходзіла пра паляванне, зброя сама выстрэльвала на шамаценне крылаў крыжака над галавой, а звараная звечару з гуртавой здабычы юшка застывала на ранак гэткім найгусцейшым халадцом, што яго можна было хіба што сякераю ўрубаць.

Мікола табе патэлефанаваў, запрапанаваў «дывертысмент для душы», і ты даў згоду, спакусіўшыся на яго легенды, на абяцаныя райскія тры дні. Сустрэча была прызначаная ў Ліпавым — першым сяле Палтаўшчыны, як ехаць аўтобусам з Кіева на Крамянчуг, тут Сула разлогім лімáнам далучаецца да левага берага Крамянчугскага вадасховішча. Мікола правёў падрыхтоўчую работу, дамовіўся з мясцовым егерам, і той перавёз вас — досыць шматлікі гурт аматараў дывертысментаў на прыродзе — кудысьці на выспы ў глыбіні ці то лімана, ці вадасховішча, дзе вы апынуліся адрэзанымі ад свету (праз пару дзён, калі скончылася прывезеная ў каністрах пітная вада, вы пілі чысты спірт і запівалі гарэлкаю, «каб не пякло»).

Табе далі чыюсь даўно не выкарыстоўваную і тым больш не прэстыжную аднаствolку, дзіцячую забаўку ў параўнанні, скажам, з бельгійскай піцізарадкай, якой выхваляўся ўчарашні воін-інтэрнацыяналіст Слаўко, расказалі, калі і куды можна і куды нельга страляць — і разышліся «па кропках». Інструктаж выявіўся лішнім, бо за ўвесь вечар, на працягу якога вакол шалела няспыннае бабаханне, пахла спаленым порахам і час ад часу непадалёк з шоргатам падаў з вышыні шрот, ты ніводнага разу не націснуў на спускавы кручок. Чакаў таго, дзеля чаго, уласна, ехаў сюды: гуртавой вячэры і паляўнічага фальклору, спрэс настоенага на выдумках і легендах, затое ж якіх!..

Была дзівосная на смак юшка з дзічыны, пілася добрая чарка, і гэта не раз, не двойчы, палымнела вогнішча да позняе ночы, і вострая на слова садружнасць не расчаравала цябе, нагаварыўшы ўсяго столькі... Ды на раніцу ў памяці тваёй зеўралі дзіркі, і засталося толькі ўражанне — цёплае, кранальнае, чароўнае.

На наступны дзень вы падняліся на зары (начавалі ў некалькіх намётах пад тысячагалосы гуд камароў, намазаўшы адкрытыя часткі цела «Тайгою») і яшчэ гадзіны дзве палохалі дзічыну бабаханнем і ваяўнічымі пераклікаміі з чароту, але неяк млява, па інэрцыі; птушкі, навучаныя ўчарашнім, ужо вас абміналі, а вячэрняе «адпусканне тармазоў» за чаркаю ў добрым таварыстве ўсё настойлівей хіліла да думкі пра сняданак. Дык вось неўзабаве вы — па двое, па адным — пачалі сцягвацца да «штаба»: даядаць і дапіваць рэшткі вячэры.

І тут ні адсюль, ні адтуль каля вас дзядзька на кані. Спешыўся, без непатрэбнай дыпламатыі падышоў да гурта, далікатна, аднак неяк надта «па-свойску» прывітаўся (відаць, у такіх таварыствах бываць яму не ў навіну, і выраз яго засмяглага цыганаватага твару наяве выдаваў прагу скласці вам кампанію за сталом у выглядзе прасцеленай на зямлі брызентыны. Яму і сапраўды налілі (сказана ж бо: у дэфіцыце апынулася чыстая пітная вада, а не спірт-гарэлка), заахвоцілі, да слова і ён прамовіў: «Дай бог паміж ног крэпкага здароўя!». Недзе пасля трэцяй паднесенай яму чарчыны дзядзька, падбадзёраны поспехам свайго тоста, перахапіў слоўную ініцыятыву і, добра ўжо нахмелены, згубіў пачуццё меры, робячыся яўна дакучлівым. Яму далі зразумець, што, шаноўны, візіт ваш зацягнуўся, чакаюць вас вялікія справы, а мы ўжо неяк самі дабудзем тут сваю паляўнічую місію. Дзядзька рэзка падняўся, выцер далонню рот і вачыма пачаў шукаць каня; той, пакінуты без нагляду, заглыбіўся ў зараснік — таксама, пэўна, трапезнічаў. «Гнядко, Гнядко!» — паклікаў дзядзька, і конь падаў голас з гушчару, а праз хвільку і сам аб'явіўся на покліч гаспадара. Дзядзька падышоў да Гнядка, леваю рукой ухапіў аброць, а правай раптам ударыў каня навадмаш па губах — і раз, і яшчэ, і ва ўсёй дзядзькавай паставе вы ўбачылі здзічэлага звера, які сам не ведае, што робіць і навошта. Гнядко асадзіў назад, але гаспадар утрымліваў яго за аброць на адлегласці, з якой яго рука магла дастаць да конскай пысы.

На імгненне вы аслупянелі, уражаныя неспадзяванай дзядзькавай лютасцю: толькі ж што ён быў часцінай вашага таварыства, еў-піў з вамі, жартаваў, здаваўся вам такім тыповым прадстаўніком роднага і любімага народа, ажно хацелася цалаваць яго ў засмяглыя шчокі і ціснуць жылістыя рукі — а ён гэтай працавітай рукою нізавошта калашмаціць такую самую працавітую жывёліну. Найхутчэй апамятаўся воін-інтэрнацыяналіст Слаўко. У два-тры скачкі падляцеўшы да дзядзькі, перахапіў таму правую руку, гатовую і далей хвастаць бязвінную скаціну, так яе сціснуў (нямарна ж прайшоў ніштаватую вывучку ў абмежаваным кантынгенце войскаў) і так зірнуў на дзядзьку, што той у вокамгненне працверазеў, умольна вызваліў руку, скочыў у старое, усё чыста ў лапіках сядло, і за ім аддалілася тупанне капытоў, пакуль і зусім не сціхла. Вы зазбіраліся, хоць егер яшчэ не хутка меўся па вас прыбыць — вось гэтак па-дурному закончыўся «дывертысмент для душы на ўлонні прыроды».

Табе прыгадаўся той жнівеньскі дзень, і ты зараз, перад уражваючым мнагалюддзем на плошчы, з гаркотай думаеш, што вось гэта ж і ёсць ён, твой народ: ён адначасова і невядома чаго азвярэлы дзядзька, і нізавошта адлупцаваны дзядзькам конь. Няшчасны, пагарджаны, без аніякага ведання аб тым, якая прыгода, зачэпка, паварот лёсу выпадзе яму праз гадзіну, праз дзень, праз год, кім ён ёсць сёння і кім будзе заўтра, якія подыхі душы скіруюць яго на тое ці іншае дзеянне, увогуле ж — на бяздзеянне, бо хіба ж можна ўзвесці ў ранг дзеі дзікае збіццё ўласнай адданай жывёліны, у якую паволі ператвараешся і сам. Табе шкада яго, гэты народ, да нерастопліванай халадэчы ў мозгу. І ты ўжо гатовы дараваць яму ўсё: і залішнюю сентыментальнасць, і флегматычную маруднасць, і генетычна перададзеную нерашучасць ды асцярожнасць, і ненавісную табе філасофію «неяк яно будзе, бо яшчэ ніколі не было, каб не было неяк», і апатыю ды абыякавасць да ўсяго, што з ім чыніла век і чыніць сёння ўлада і дзяржава.

Бо гэты народ — твой і такі, і калі ты хочаш зрабіць штосьці разам з ім, ты мусіш мець жалезнае цярпенне, мусіш прыпадобніцца скульптару, што рукамі, на якіх няма і не павінна быць накрухмаленых манжэтаў, адкрышвае ад гранітнай камлыгі непатрэбнасць да той пары, пакуль застанецца плод задуманага.

Пераклаў з украінскай Валер Стралко.

Цалкам раман можна прачытаць у чарговым нумары часопіса «Дзеяслоў» (№3 (64)).



Гэты народ — твой і такі, і калі ты хочаш зрабіць штосьці разам з ім, ты мусіш прыпадобніцца скульптару, што рукамі, на якіх няма і не павінна быць накрухмаленых манжэтаў, адкрышвае ад гранітнай камлыгі непатрэбнасць



▸ ЭСЭ

ПАХ ПІЛАВІННЯ

Валеры СТРАЛКО

Раней кожнаму пакаленню выпадала вайна, а то й не адна. Гэта было звычайна і звычна: вайна перыядычна выконвала сваю жудасную «праполку», зменшваючы колькасць спажыўцоў зямных рэсурсаў.



Ужо амаль тры пакаленні запар у нас вырасла без вайны. І псіхолагі з сацыёлагамі насцярожана прыглядваюцца да «нетрадыцыйнай» генерацыі людзей, аналізуючы, а што ж прынесла ёй безваенне…

Даводзіцца чуць і час ад часу пераконвацца нават, што моладзь сённяшняя забыла божыя запаведзі, што свет дэградуе, перапаўняецца фальшам, злом і сквапнасцю, што несправядлівасць заваёўвае ўсё новыя і новыя пазіцыі. Магчыма. Цалкам магчыма. Але нават тыя, хто перажыў вайну не на фронце, а ў акупацыі ці нават у тыле, наўрад ці прагаласуюць за тое, каб зніжэнне маральнага стану грамадства лячыць новай вайной. Надта ж люты ўдасканальвальнік людской пароды — вайна…

Нарадзіўся я за тры гады да вайны ў Любечы на Чарнігаўшчыне. Гэта на Дняпры. Смутна прыгадваю шырэзны луг, што пачынаецца ўнізе, пад гарою, і працягваецца далёка, да рэчкі. Рэдкія хаткі, спавітыя лёгкім туманцам. І ты быццам ляціш над усім гэтым прасторам. Адчуванне лёту, спакою, святла і дзіўнай радасці… Бо стаіш на ўзвышшы… Маці, сама ўлюбёная ў Любеч, расказвала, як я часта і падоўгу ўзіраўся ў затуманенае бязмежжа. Не выпадкова, мабыць, вабіла мяне яшчэ тады загадкавая, чароўная задняпроўская далёкасць. Там пачыналася Беларусь, дзе жыву я апошнія амаль 43 гады…

Як даўняе, няяснае ўяўленне, прыпамінаюцца першыя адчуванні вайны. Яны — без кроплі страху. Мы двое сутак павольна цягнуліся ў калоне бежанцаў на падводзе, набітай убогім скарбам, — на радзіму маці, у сяло Тупічаў (60 км на ўсход). Часам нізка-нізка над намі прашугвалі нямецкія самалёты. Вознік кідаўся трымаць каня, маці, спаралізаваная страхам, падала ў кювет, адкуль глядзела, як мы з братам на возе захлынаемся смехам, бо ў нас самалёты выклікалі прыступы весялосці…

Прысунуліся мы ў Тупічаў увечары 28 жніўня 41-га года і супыніліся часова ў былой дзедавай хаце скрай сяла. Яшчэ дарогаю суправаджала нас амаль суцэльная прыглушаная кананада і аддаленыя, ледзьве чутныя аўтаматныя чэргі, адзінкавыя стрэлы. А тут, у вёсцы, усё гэта хутка стала больш выразным. Раніцою 29-га — досыць блізка. Мы палезлі ў сховішча да суседа Шкіліндзея. (У Тупічаве шмат звычайных, зразумелых старажытных прозвішчаў: Лях, Чэх, Швед, Літвін, Аўчар, Туз, Баран, Казёл, Тупік, Сянюк, Майсюк, Магілёвец, Маскалец… Але ж нямала і дзіўнаватых: той жа Шкіліндзей, а яшчэ Бакцідан, Сапітон, Пакармяка, Лычуха, Мазголік, Пініца, Сорва…). Дык вось, па абедзе зусім побач узнялася новая страляніна, аж часам сыпаўся пясок са столі, — ужо недзе тут, адразу за сялом.

Праз пару дзён за дваром, каля дарогі на Чарнігаў, выяўляем мы з братам вялізныя свежыя могілкі з бярозавымі крыжамі і каскамі на магілах. Бабуля штодзень загадвае нам: «Да магілаў — ні нагою. Немец пастраляе!». Яна тады яшчэ не ведала і пільна сачыла, каб не ўляпаліся мы ў якую бяду.

Неяк пазней, відаць, у снежні, бабуля раптам — за нас і ў царкву, бо папаўзлі чуткі, што нехрышчоных дзяцей немцы страляцьмуць… Жывая яшчэ хрышчоная маці наша, Марыя Якаўлеўна Швед, а бацьку хрышчонага, настаўніка Васіля Туза, хутка пасля таго застрэлілі партызаны. Быццам бы памылкова. Бабуля Фядося, усе да ніткі сілы патрацішы, каб мы выжылі тады, адышла на вечныя сны ў канцы мая 45-га…

Выжываць маці з бабуляй і намі, двума малалеткамі, без пастаяннага свайго кутка, без мужыка ў хаце (бацька з 39-га па канец 46-га — у войску) было няпроста. Не было ж ні грошай (дырэктар Любяцкой школы Фёдараў з адпускнымі ўсіх школьных настаўнікаў збег у эвакуацыю), ні запасаў, ні каштоўных рэчаў, каб прадаць, не было. Найчасцей выручала цётка Моця, старэйшая сястра маці. А так — ні хлеба, ні іншага харчу, ні солі, ні запалак, ні дроў. Анічога. Прыгадваю: пазычыўшы недзе пілу, маці з намі хадзіла ноччу ў маразы-снягі пілаваць галіны ў яблыневым садзе. Яна з аднаго боку, мы — з другога смыкаем пілу, рукі-ногі акалелі. Але такі чароўны пах вырываўся з-пад пілы!.. Голле яшчэ перацягнуць да хаты трэ было, спілаваць на паленцы, пакалоць-пасекчы… А яны ж, дроўкі сырыя, не хочуць у грубцы гарэць, паддуваем у тры раты, якія жэрці прагнуць, а не дзьмуць…

Неяк, хоць і ноч, падлавіў нас Іван Ілліч, які садоўнічаў і ў памешчыка, і ў калгасе, а цяпер… Стары доўга прабіраў (быццам нам самім не горка было дрэвы калечыць!), абяцаў заявіць немцам, якія за падобныя дзеі маглі стрэльнуць. Злітаваўся, мабыць…

Раз маці схадзіла за 22 км у Седнеў і на кірмашы выменяла (за якую рэч?) шклянку солі. Во свята было! А яшчэ часта чадзелі мы з братам. Бабуля, каб захаваць цяпло і вуголле да раніцы, дачасна закрывала юшку. Нярэдка, атручаных чадным газам, з невыносным галаўным болем, нас няшчадна ўсю раніцу ванітавала. І добра яшчэ, калі ўдавалася захаваць жар. Часцей жа хапала бабуля бляшанку і сыходзіла за ім да няблізкіх суседзяў…

Ледзве ўцалелі мы ў першую ваенную зіму. Вясною надыбалі нейкі кавалак зямлі, засадзілі-засеялі (зноў цётка Моця паспрыяла), восенню тое-сёе сабралі — і зіму сустрэлі з пэўнымі запасамі. Не было ніякага тлушчу, але ж бульба, бурачкі з морквай і фасолькай не далі прапасці з голаду. А вось абутак мы дабілі ўшчэнт, і што робіцца ў двары, магліназіраць (як у тэлевізар) праз шыбкі, якія пры добрых маразах даводзілася часта прашкрабваць. Так што гэтую і яшчэ адну ці дзве зімы заставаліся мы без вуліцы, без свежага паветра, кіслі ў хаце…

Нямала ўспамінаў звязана з ліпняком, былым памешчыцкім паркам, бо жылі мы вельмі блізка ад яго. Падчас акупацыі ў Тупічаве было адносна ціха, да партызанскага краю ці зоны было кіламетраў 20-30. Немцы і паліцаі паводзілі сябе па ваенным часе досыць стрымана, больш жорсткімі былі мадзяры.

Захаваўся калгас. Яго старшыню, Алейніка, мужыка маладога, кемлівага і рупнага, паставілі немцы па просьбе сялян яшчэ і старастам. Людзі былі ім задаволены, ён стараўся па магчымасці не крыўдзіць нікога, многім дапамог пазбегнуць адправкі ў Нямеччыну. Вярнуліся нашы, яму і паліцаям упаялі па дваццаць пяць гадоў лагераў.

На тле адноснага спакою позняй восенню 42-га наляцелі раптам партызаны (каб адбіць захопленую немцамі партызанку). Не адбілі. Расстралялі яе немцы потым. Закапалі каля глінішча. Помню — дзе. А сам бой адбываўся ноччу, блізка ад нашай хаты. Выбухі, страляніна. Кулямі выбіла ў нас колькі шыбак. Загарэлася школа-казарма. Мы з братам на печы «надзейна» схаваліся пад радном. Вызірнеш — страхата: ад сцяны блізкага ліпняка адбіваюцца водбліскі пажару, дый бухі-стрэлы збоку, злева ад хаты… Потым хадзілі на папялішча. Шкадавалі. Яшчэ летам круціліся мы часцяком тут, ля казармы, хоць маці строга забараняла. Неяк паспыталі нават нямецкага гарохавага супу. Варожы, а смачны, халера... Упершыню бачылі тут нейкае прапагандысцкае кіно (само кіно — упершыню!), у якім нямецкія салдаты за шкірку выцягвалі з-пад лістоты ў лесе мізэрна-нікчэмных барадатых партызанаў, а тыя падалі на калені і, пэўна, малілі не забіваць…

Перад прыходам нашых ліпняк запоўніўся падводамі з сем'ямі нетутэйшых паліцаяў, якія разам з немцамі планавалі рухацца на захад. Адзін з іхніх мальцоў доўга і настырна задзіраўся біцца да майго брата. Той не вытрымаў і адгамселіў нахабніка. Як развярнуўся ж той паліцайчык і пад крыкі «Зараз прийде мій тато і постріляє ва-а-ас!» пабег у ліпняк. Мы доўга хаваліся, і толькі цёмначы ціхенька прашкрэбліся ў хату. Ледзь заспакоілася маці, якая была ўжо ў адчаі. А раненька бабуля пабудзіла нас, бо не змагла адчыніць дзвярэй з сенец на вуліцу. Мяне, дробнага, выпхнулі праз дзірку ў акне. Клямка звонку была закручана дротам, а на атынкаванай белай сцяне цямнела велізарная пляма ад газы ці бензіну, якую потым так і не ўдалося забяліць. Хацелі спаліць нас, ды нешта перашкодзіла. Мабыць, дачуліся пра нашых, што з'явіліся праз якую гадзіну…

У дзень вызвалення, 23 верасня 43-га года, майму брату Уладзіміру, тады Вову, стукнула якраз 6 гадоў. Выйшла, што зрабілі яму падарунак не толькі нашы, але й немцы: нашы — што прыйшлі, немцы — што сыйшлі. Як зачаканіўся ў памяці шэраг эпізодаў гэтага дня. Выбраўшыся з хаты, падбягаем да вогнішча, у якім гарыць усялякі хлам, і тут брат кідае ў полымя знойдзеную паблізу чорную паліцайскую пілотку. Потым паасобку пачынаем абследваць двор. Вось я знаходжу ладны хімічны алоўак: «О!» Вось за рэмень падвалочваю да чырвонаармейца знойдзены ў бур'яне ці кустах нямецкі карабін, і той гучна і павольна, з усмешкай, цягне: «Ну ма-ла-дзец!». Хутка падбягае брат і за руку цягне мяне ўбок, сярдзіта шэпчучы: «Нашто аддаў?! Самі б стралялі…» Вось, узяўшыся за рукі, імчымся ў любы ліпняк. Ён ужо — без паліцайскага абозу! Там скраю стаяць кінутыя немцамі і паліцаямі павозкі і легкавікі без колаў, у адным з якіх знаходжу шафёрскія акуляры. Далей, у копанцы без вады — ХТЗ-шны колавы трактар і з пагнутым рулём матацыкл. Скрозь рознае смецце, нечыстоты і нядобрыя, чужыя пахі. Вывуджваем з брудУ савецкую кулямётную стужку з патронамі, цягнем і кідаем яе ў папялішча збожжасховішча. Праз якую хвіліну ўсчынаецца бязладнае бабаханне…

Пазней даведаліся, што перад падпалам частку збожжа немцы раздалі вяскоўцам…

Вельмі ж пашыранымі ў вайну былі словы, вытворныя ад «страляць»: стрэл, пастраляць, выстраліць, стрэліць, застрэліць, расстраляць… Яны часта ўжываліся ў размовах дарослых і пацанвы ці проста віселі ў падсвядомасці. З часам гэтыя грозныя словы зрабіліся звычна-будзённымі. У вайну і доўга пасля стралялі мы з самапалаў, напеканак, пісталетаў, а болей — узрывалі патроны, міны, снарады, саваробныя, з выкарыстаннем буйнога артылерыйскага пораху (яго нямала было на гародах), выбуховіны. Неяк сядзелі мы ў двары, і Вова па маёй просьбе выцягнуў кальцо (падалося мне, што яно лішняе там) з цыліндрычнай гранаты (накшталт РГД-42), ды калі нешта ў ёй пстрыкнула, спалохана адкінуў убок. Выбухам нас адшпурнула пад плот. Падхапіўшыся, аглушаныя, задымленыя, ашалела бяжым з двара, у Вовы кальцо на пальцы целяпаецца, а збялелая маці з парога нешта адчайна крычыць услед…

Гінулі, калечыліся дзеці. А дарослыя… Перамога з самага пачатку вайны здабывалася небывалай крывёю. Тупічаўцы ваявалі на розных франтах. Не вярнулася з вайны 345 чалавек. Яны загінулі, бароняч ці вызваляючы хаты незнаёмых суайчыннікаў. Велічны помнік ім стаіць на беразе ставу. За Тупічаў ваявалі і гінулі іншыя, хоць і свае, салдаты і камандзіры. Ляжаць яны ў двух брацкіх магілах у цэнтры сяла…

На гародах некалькіх суседзяў, дзе зараз бацькоўская хата, былі пахаваны ў брацкіх магілах многія чырвонаармейцы, ахвяры 41-га. Помню, як парэшткі іх перахоўвалі ў агульную брацкую магілу ў цэнтры сяла ў 1949-м. Суседзі расказвалі, што не вельмі ўдалая атрымалася іх смерць, бо спачатку яны адступілі да спіртзавода, дзе, начаставаўшыся каварнай прадукцыяй, раніцой рашуча рванулі назад, у контратаку, ідучы на варожыя кулямёты ў поўны рост. Немцы іх на тых агародах і паклалі. Няспешна, быццам на палігоне. Мабыць, радаваліся лёгкай перамозе. Ды помста нядоўга чакала…

А «аўтарам» згаданых вышэй нямецкіх могілак быў наш невысокі чарнявы салдацік з невядомым прозвішчам па імю Мікалай, які, ці каб прыкрыць адыход савецкіх часцей, ці каб дабравольна-самаахвярна адпомсціць за нядаўнюю, такую недарэчную гібель сваіх таварышаў, забраўся з «дзегцяром» на старую вярбу і, падпусціўшы калону, што выйшла з узятага Тупічава да Чарнігава, расстраляў яе ва ўпор. Немцы ад злосці скалолі ўжо мёртвага байца штыкамі і забаранілі вяскоўцам яго хаваць. Ды сусед Андрэй Кароткі перанёс ноччу цела героя да сябе ў сад і там таемна пахаваў. На месцы гібелі таксама даўно стаіць помнік з надпісам «…знішчыў да паўроты фашыстаў…».

Вайна яшчэ працяглы час жыла ў нас, нагадвала пра сябе. І тым, што ў класах з трыццаці чалавек бацькоў мелі не болей трох-пяці вучняў, і тым, што даўжэнька амаль не было ў калгасе коней ды машын-трактароў, і людзі (школьнікі ў тым ліку) апрацоўвалі свае гароды рыдлёўкамі, і тым, што на працадзень у калгасе давалі капейкі ды паліцы ў прадуктовых і прамтаварных крамах пуставалі. Я, з'ехаўшы з Тупічава ў 55-м (пасля дзесяцігодкі, на Херсонскі суднабудаўнічы завод), толькі праз год перастаў адчуваць, што неадчэпна хочацца есці…

Адно вошай было доўга ў дастатку…

РЭЦЭНЗІЯ

ДАСТАЦЬ З ВОКА ПАРУШЫНУ ЗДЗІЎЛЕННЯ

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Калісьці ў «ЛеГАЛізацыі» я пісаў пра кніжку Сяргея Рублеўскага«Азярод» так: «У гэтым годзе ў часопісе «Маладосць» я ўжо спрабаваў увесці ў кантэкст сучаснага літаратурнага працэсу кніжку прозы гэтага віцебскага аўтара. Называлася яна «Апостраф». Таму новае выданне Сяргея чакалася са своеасаблівым пачуццём трывогі: што ж далей?.. Аднак «адарвацца» ад першай сваёй адметнай кніжкі рэдка якому, нават вельмі таленавітаму, аўтару ўдаецца. Не ўнік гэтага і С.Рублеўскі. «Азярод» трымаецца за «Апостраф». Уласна я думаю, што гэта няблага. А наколькі яно будзе добра, пакажуць ужо наступныя кніжкі аўтара».

Кніжка С. Рублеўскага, пра якую я пішу зараз, называецца «Паспець надыхацца», і выйшла яна напрыканцы 2012 года адначасна з яшчэ адным зборнікам малафарматнай прозы гэтага выбітнога пісьменніка з Віцебшчыны («Святло лускі»).

Як аказалася, аўтар — заўзяты рыбар, а таму яго знакавая характарыстыка мысляра-адзінотніка асабліваму сумненню не падлягае. Ды й казаць, што ўсе гэтыя гады я чакаў ад пісьменніка нейкага фундаментальнага твора, тыпу рамана, было б няпраўдай. Чакаў якраз менавіта таго, што цяпер і маю пад рукою — кніжку кароткіх эсэ, ёмкіх разважных зацемак ды лірычных мініяцюр… Нешта ёсць у С. Рублеўскім і ў яго творчасці ад вядомых мэтраў сцісласга жанру М. Прышвіна і Я. Брыля. Ну вось, скажуць, рэцэнзент у сваім рэпертуары, на каго замахнуўся, з кім параўнаў! А няўжо ж, парырую я, мне замахвацца на Галубовіча ці Камейшу, хоць і гэткі варыянт, можа, не такі ўжо кепскі… Пішу як думаецца і, спадзяюся, што так яно і ёсць.

У своеасаблівым зачыне да кнігі С. Рублеўскі даводзіць чытачам, што піша алоўкамі, распавядае пра сам працэс падрыхтоўкі да літаратурнай працы і прыпісова дадае ў фінале: «Неўзабаве я зразумеў, што галоўная праблема пры пісанні алоўкамі — гэта іх завостраванне, падчэсванне грыфеля да шылавай дзюбкі». І тут, я вам скажу, пазначана не толькі абгавораная «праблема», але ў падтэксце прасвечваецца намёк на «завострыванне» і «падчэсванне» да тонкай вастрыні самой мастацкай асновы твора, гэта значыць, аловак, як прылада працы, адкідвае свой «цэнь» і на творчасць, як на сэнс і сутнасць самой працы.

У тэкстах С. Рублеўскага няма пустаслоўных хадоў на публіку і чытача (сцёбу, правакацый, шакіруючых сцэн і цынізму). Ёсць выверааны класічна-традыцыйны стыль, пазбаўлены «ружова-туманнага» сацрэалістычнага ідэйнага стрыжня. Шчыры, цёплы і даверлівы маналог (які нярэдка пераходзіць у дыялог) з магчымым чытачом-чалавекам насупраць, якога ён абірае за слухача і субяседніка.

Ёсць вялікая, не напускная, а непасрэдная, не трафарэтна-лозунгавая, разлічаная на зваротную адэкватную плату любоў да малой і вялікай радзімы, да сваіх бацькоў і акаляючых людзей, традыцыі, мовы і жыццядайнай прыроды… Не хацелася б тут дадаткова спекуляваць на гэтай тэме, бо аўтар да таго не схільны.

А вось да каго ён неспакойны, дык гэта да нашых беларускіх жанчын (каханак, палюбоўніц, жонак, маці, працаўніц і прадаўжальніц роду), хоць, бывае, выкажацца так неасцярожна, што мне як чытачу робіцца трывожна за яго. Да прыкладу, я асабіста не насмеліўся б на такую канстатацыю: «У жанчыне няма праўды, толькі — сэнс», не кажучы ўжо пра характарыстыку «слабай паловы» як асобы творчай (працытую, са спадзевам, што шмат каму, хто пра гэтую кніжку яшчэ не ведае, будзе цікава): «Жанчына-рэдактар — гэта незабыўна. Закручваеш вербальны павеў, узвіхурваеш кветкавы пылок слоў, каб з якога-небудзь новага апладнення з'явіўся вобраз ці хаця б цень самачыннага свету, дарма, што не Божага, але ж таксама незамененага, а яна кажа:

— Крывавата напісана… І надта накручана, трэба прасцей…»; «Жанчына-крытык засўёды падобна на маю жонку. Яніна любіць разгадваць крыжаванкі пасля мяне — падабаецца ёй упісаць у вольныя клетачкі колькі слоў і гэтым пацвердзіць: я трошкі разумнейшая за цябе, вось, зірні…»; «Жанчына-празаік… Як сказала, здаецца, руская пісьменніца Вікторыя Токарава, мужчына піша, трымаючы ў сэрцы і ў свядомасці Бога, жанчына — любімага мужчыну… (…) Жанчына, якая аналізуе каханне (а міжволі даводзіцца) усё адно што распускае вочкі свайго швэдра, да апошняга, і на сіверку рацыяналізму застаецца ў абдоймах дрыжакі. Становіцца празаікам»; «Жанчына-паэт (паэтэса, паэтка — полавае прыніжэнне, якое прыдумалі літаратурныя артадоксы) вяжа са слоў рэдкі швэдар сваёй жарсцевай закаханасці — на голае цела. Усё прасвечваецца. Неатуленае жыццё пад позіркам абачлівых і спавітых перасцярогай. Словы ёй спадарожнічаюць, але не ратуюць»…

Агулам пра літаратуру і літаратараў у кніжцы напісана шмат чаго. І пераважна цікавага, а нярэдка і займальнага. Скажам,



але тут заўважаны мной (не ў звязку з пэўнай, няхай і ўскоснай прылучнасцю рэцэнзента да прадмета гаворкі) з прычын яго палемічнасці. Спярша аўтар піша: «Пісьменнікі, якія зусім не п'юць, почасту пішуць прыкметна горш, чым піткі. Надта напружваюцца, уважаючы літаратурную работу за даверану звышай місію. А таго не ведаюць, што ў падвясёленых жылах і словы лепш пульсуюць». А калі ведаюць (тут ужо я наўпрост даводжу ўласную закапочанасць гэтай праблемай) і, магчыма, больш за іншых, і больш не жадаюць таго адчування ведаць? С. Рублеўскі, як прадчуваючы падобныя пытанні, счакаўшы, піша наступнае: «Калі прыпынюся, азірнуся на пражытае, шкадую п'яных дзён… (…) Бо страчаны ж не столькі напой, колькі хвіліны натхнення, супакою, шчодрай адзіноты». Хоць па вялікі рахунку, на мой досвед, аўтар мае рацыю ў абодвух выпадках. Вось шчаслівыя творцы, якія могуць іх спалучыць і мець з той гармоніі шчодры літаратурны плён. Бо пакласці ўласнае жыццё «на аўтар Бахуса» адважваюцца толькі адзінкі, ды і тыя, відаць, ці то Богам абраныя, ці то д'яблам пакліканыя…

Як трапна казала маці С. Рублеўскага: «Хіба можна столь з нябёсамі раўняць?!».

Цікавы ў гэтым плане іранічна-спачувальны (да сябе і калег) запіс-згадка пра тое, як у 60-х гадах адзін пісьменнік прыехаў у глыбінку напісаць пра калгаснае жыццё. Выпіў з мужыкамі ды і прысну на ўскрайку дарогі. І тут «як на тое, ехаў кіраўнік гаспадаркі.

— А хто гэта ляжыць? — зацікаўлена пытаецца ў шафёра.

— Ды пісьменнік са сталіцы прыехаў…

— Стой, тармазі. Давай назад, — загадаў узрушаны старшыня. — Ніколі не бачыў жывога пісьменніка…

Цяпер і блізка няма такой цікавасці да майстроў слова».

> «Як на тое, ехаў кіраўнік гаспадаркі.
> — А хто гэта ляжыць? — зацікаўлена пытаецца ў шафёра.
> — Ды пісьменнік са сталіцы прыехаў…
> — Стой, тармазі. Давай назад, — загадаў узрушаны старшыня. — Ніколі не бачыў жывога пісьменніка…
> Цяпер і блізка няма такой цікавасці да майстроў слова»

Незважаючы на падтэкставую анекдатычнасць запісу, трэба пагадзіцца хаця б з тым, што ў цяперашняй нашай няпростай літаратурнай і грамадскай сітуацыі аніякі, няхай нават і былы, старшыня калгаса ўжо не спыніцца, не прытармозіць і назад не дасць. Бо ёсць як ёсць. У кожнага часу свае часовыя старшыні і пісьменнікі. За рэдкім выключэннем. Хоць непадалёк аўтар і прагаворваецца, што яму «хацелася б пасябраваць з якім-небудзь пісьменнікам, але, відаць, не атрымаецца. Калегі дужа ганарлівыя, самадастатковыя, эгаістычныя. Вось жа і мне хочацца стаць такім…». Тут, на маё разуменне, найбольшы ўнутраны акцэнт (завуаліраваны, вядома) пастаўлены не на «якім-небудзь» пісьменніку, а менавіта на «такім», якім аўтару хочацца стаць самому…

У саміх тэкстах шмат згадак пра сучасных, у тым ліку і маладых, паэтаў і пісьменнікаў, з лаканічнымі, але арыгінальнымі і нярэдка трапнымі характарыстыкамі іх жыцця і творчасці…

У чытача можа скласціся ўражанне, што кніжка спрэс трымаецца на літаратурных асацыяцыях ды ўнутраных праблемах і перажываннях аўтарам свайго творчага выраку, яго суб'ектыўных поглядах на пісьменніцтва ды ўласных лабараторных спробах яе аналізу… Зусім не. Кніга шматгранная і шырока разгалінаваная як само чалавечае жыццё. Пісьменнік спрабуе зазірнуць у нутро самога сябе, пераадолеўшы ўласнае эга, высновацца вартасную сутнасць чалавека як боскага праабраза і самага разумнага зямнога індывіда агулам. У чым наша прызначэнне, хто мы ёсць, каму, навошта і для чаго?... Так проста і адназначна на такія пытанні не адказаш, а ўскладняючы адказ задачу тым больш не вырашыш… Што ж застаецца? Развага, пошук, прадчуванне і празарэнне… Калі коратка: творчасць і літаратура, як у нашым выпадку.

І тут пачынаць трэба, прабачаючыся за таўталогію, з уласнага пачатку. Ці не таму вялікая доля нататак і мініяцюр аддадзена спрадвечнай тэме радзімага кутка, бацькам (найперш маме), знаёмым, роздумам над лёсам Айчыны, яе народа, мовы…

Што да мацярынскай мовы, то ў зборніку пра яе напісана з сыноўняй любоўю да абедзвюх, каб не быць галаслоўным, прывяду колькі малавядомых (прынамсі мне) слоў і выслоўяў мамы С. Рублеўскага: вада на дне вядра —ападонне, зрэбная саматканая посцілка на ложку — радабоць, цыраваць адзенне ды мяхі — лапіць, мацаваць вялікодныя яйкі — пазубіць, зняславіць, прынізіць — здалізаваць , ракавыя клюшні — абцужкі, спешчана-мондрыя людзі — нотныя, сагнуць, скрывіць — «старую вярбу вецер вывіхнуў», альбо такія выслоўі: «во сёлета бульба ўрадзіла — адгробу няма», «з гумавага шарыка вышапаціньвае паветра»…

Увогуле пра маму напісана вельмі душэўна, шчыра, з сыноўняй любоўю і слязой на сэрцы. Проста з налапу чалавек так не скажа: «Няма на свеце больш трывушчай беларускі, чым мая мама». І гэтак, я перакананы, сказаў бы і не раз яшчэ скажа амаль кожны з нас пра сваю маці. У тым ліку — і пра нашу маці-Беларусь…

Запомніліся выбітныя афарызмы С. Рублеўскага, рассыпаныя па ўсім тэксце кнігі: «Пісьменнік хоцькі-няхоцькі, пакрысе становіцца магілкавым кладзішчам сваіх задум»; «Празаікі — гэта працвеперазелыя ад хмельнай раніцы жыцця паэты»; «Не рабі вялікі запас, каб не сказалі: ну, гэтага табе хопіць да самай смерці»; «Прарочае слова — азіміна, усе астатнія — паспешлівая ярына», «У дзяцей куды менш грахоў, чым у бацькоў. А мы іх вучым, вучым…»; «Пішу, як грашу, знянарок і заўсёды нібы ўпершыню»; «Пішаш каторы раз адну і тую ж кніжку… А трэба пачынаць новую»…

Трэба сказаць, што, чытаючы С. Рублеўскага, сям-там мне карцела нешта паправіць у мове, але нейк тут жа рукі і апускаліся, думалася: мабыць, там, на Віцебшчыне, яно так і трэба: «нарадзіць свайго (а не сваё. — ЛеГАЛ) цяля», «выносіць на руках, як немаўля ці немаўлё. — ЛеГАЛ)»… Але гэта такія як бы між іншым вымаўленыя дробязі.

Уразіла кароткае эсэ-ўспамін пра бацьку «Не міргаючы вачыма», той навык, пераняты ад вясковай бабы Ганны, якая даставала языком парушыны з дзіцячых вачэй, які спатрэбіўся, калі бацька пры пагрузцы сена запарушыў вока і сын насмеліўся дастаць тое парушшо сваім языком… Асабліва вось гэтая безвымоўная ў творчым аспекце і нерукатворная канцоўка: «У дзяцінстве куды часцей запарушваеш вочы, чым у сталыя гады. Глядзіш на свет яшчэ здзіўлена, амаль не міргаючы, — вось і маеш».


Маеш сваю долю, свой светапогляд, свой стыль, сваю кніжку, у рэшце рэшт, самога сябе: таленавітага пісьменніка Сяргея Рублеўскага…

Зрэшты, як прызнаецца аўтар, і я тут з ім зноў жа салідарны: «Люблю шматкроп'е. Усяго не скажаш…».

▸ ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

КІПЛІНГ І ПЛАГІЯТ

У Вялікабрытаніі выстаўлены на таргі ліст класіка ангельскай літаратуры Рэдзьярда Кіплінга, у якім пісьменнік прызнаецца ў плагіяце асобных ідэй з «Кнігі джунгляў».



Ліст, адрасаваны невядомай жанчыне, быў выяўлены ў красавіку гэтага года сярод кніг і дакументаў, якія захоўваліся ў адной з брытанскіх антыкварных крамаў.

У сваім пасланні Кіплінг распавядае, што запазычыў частку задум для «Кнігі джунгляў» з фальклору эскімосаў, акрамя таго прызнаецца: «Вельмі імаверна, што я паддаўся запазычанням, але цяпер ужо не магу згадаць, чые гісторыі я ўкраў».

Ліст датаваны 1895-м годам.

Таргі праводзіць брытанскі аўкцыённы дом Andrusier Autographs. Стартавы кошт ліста 2, 5 тысячаў фунтаў стэрлінгаў (3,7 тысячаў даляраў ЗША).

«Кніга джунгляў» (1894), якая распавядае пра прыгоды хлопчыка Маўглі — адзін з найвядомых твораў Кіплінга.

У 1907 годзе Кіплінг стаў першым ангельцам, які атрымаў Нобелеўскую прэмію па літаратуры.

ДЭН БРАЎН І ФІЛІПІНЫ

Мэр Манілы, філіпінскай сталіцы, Франсіс Таленціна напісаў адкрыты ліст амерыканскаму пісьменніку Дэну Браўну, у якім абвінавацію аўтара ў аднабокім апісанні горада.

Мэр заявіў, што Браўн апісаў толькі дрэнныя бакі жыцця філіпінцаў і праігнараваў добрыя якасці. Ён назваў апісанне горада «недакладным» і падкрэсліў, што філіпінцы здольныя на добразычлівае і спачувальнае стаўленне адзін да аднаго. «Наша мясцовасць — уваход у рай», — заявіў чыноўнік.

У кнізе Дэна Браўна «Інферна» гераіня апісвае Манілу як «браму пекла». Яна едзе туды ў надзеі ўбачыць «краіну цудаў» з незвычайна прыгожай прыродай, аднак сутыкаецца з крыміналам, галечай і дрэннай экалогіяй. Сярод іншага, яна апісвае сэкс-індустрыю краіны, якая складаецца толькі з дзяцей, прычым часцяком іх у прастытуцыю прадаюць самі бацькі. Паводле яе, у горадзе людзі падпарадкаваны прымітыўнаму інстынкту выжывання і, прабываючы ў роспачы, ператвараюцца ў жывёлаў.

Гэта не першы раз, калі кіраўніцтва Манілы абражаецца апісаннем горада ў мастацтве. У 1998 г. Філіпіны абвясцілі персонай нон-грата амерыканскую актрысу Клэр Дэйнс і забаранілі да паказу ўсе фільмы з яе ўдзелам. Гнеў кіраўніцтва краіны выклікала адно з інтэрв'ю, у якім Дэйнс апісала краіну як «прапахлую прусакамі». «У Маніле няма каналізацыі, у людзей тут няма наогул нічога. Часцяком у іх няма нават рук, ног, зубоў ці вока», — распавяла актрыса.

Кніга Дэна Браўна «Інферна» выйшла 14 траўня 2013 г. і стала шостым раманам пісьменніка.

ФІЛЬМ ПРА АСТРЫД ЛІНДГРЭН

Ужо вядома, што карціна пра выдатную шведскую пісьменніцу будзе называцца «Астрыд», а яе стварэннем зоймецца дацкая рэжысёрка Перніле Фішэр Крыстэнсэн.

Паводле яе слоў, творчасць Ліндгрэн вельмі блізкая рэжысёрцы, і ў стужцы Крыстэнсэн плануе перадаць працэс стварэння вядомых казак пісьменніцы праз прызму яе нялёгкага лёсу. Праца над фільмам будзе завершаная ў 2014 годзе, а прэм'ера запланаваная на пачатак 2015-га.

Адной з цэнтральных тэмаў стужкі «Астрыд» будуць адносіны паміж пісьменніцай і яе сынам Ларсам. Зацяжарыўшы ў 18-гадовым узросце (у 1926-м) ад жанатага мужчыны, Астрыд аддала сына ў дацкую прыёмную сям'ю, бо не мела магчымасці клапаціцца пра хлопчыка. Пазней, знайшоўшы пастаянную працу, пісьменніца забрала хлопчыка, а ў 1934 годзе нарадзіла дачку Карын, для якой, дарэчы, прыдумала першыя гісторыі пра Пiпi Доўгуюпанчоху, якія пазней леглі ў аснову аповесцяў.

Сярод кніг пісьменніцы, якія з дзяцінства знаёмыя многім з нас, — казкі пра Эміля з Лёнебергі, Малога і Карлсана, серыя апавяданняў пра Кале Блюмквіста, аповесці «Міё, мой Міё» і «Роні, дачка разбойніка».

Астрыд Ліндгрэн памерла ў 94-гадовым узросце ў 2002 годзе ў Стакгольме. Яе імем названая прэстыжная міжнародная прэмія за ўнёсак у дзіцячую літаратуру, цырымонія ўручэння якой штогод праходзіць у Швецыі.

ІЗРАІЛЬ, ГРОШЫ І ПАЭТЫ

Улады Ізраіля зацвердзілі канчатковы выгляд дзяржаўных грашовых знакаў. Замест партрэтаў палітыкаў на банкнотах будуць выявы паэтаў.



Аднак выбар партрэтаў адразу выклікаў крытыку. Банкноты вартасцю 50 і 200 шэкелей выйдуць у манетарны абарот да канца 2013 г. На іх будуць партрэты класікаў нацыянальнай літаратуры Шаўля Чэрніхоўскага і Натана Альтэрмана. На банкнотах вартасцю 20 і 100 шэкелей будуць партрэты паэтэс Рахелі (Блуўштэйн) і Леі Гольдберг. Эмісія гэтых купюраў запланавана на пачатак 2014 г.

Прычына, праз якую ўрад Ізраіля быў абвінавачаны апазіцыяй у астракізме, «геаграфічная»: на банкнотах зноў знайшлося месца толькі для ашкеназі (габрэі, выхадцы з Паўночнай Амерыкі і Еўропы), а ўсходні габрэй-сефард толькі адзін раз быў адлюстраваны на купюрах — Майсей бэн Маймон (Маймонід), сярэднявечны вучоны, філосаф і багаслоў. Ар'е Дэры, адзін з лідараў ізраільскай рэлігійнай сефардскай партыі ШАС, абвінаваціў урад у дыскрымінацыі сефардаў і заявіў журналістам: «Цяжка сабе ўявіць, што з ліку ўсходніх габрэяў не атрымалася знайсці ніводнага паэта… Банкноты з такім партрэтам не страцілі б у вартасці».

Варта адзначыць, што выбар «кандыдатаў» для размяшчэння на новых купюрах Ізраіля быў праведзены папярэднім кабінетам міністраў краіны з удзелам фракцыі ШАС…

Крытыка, аднак, была пачута. Кабмін звярнуўся да Банка Ізраіля з прапановай змясціць на банкнотах «партрэты мужчын і жанчын, прадстаўнікоў усёй ізраільскай грамады». У якасці першай кандыдатуры Біньямін Нетаньяху, прэм'ер-міністр Ізраіля, прапанаваў Егуду ха-Леві, сярэднявечнага паэта з арабскай Іспаніі, дзе і была сфармавана грамада сефардаў.

ДА ЮБІЛЕЮ ШАЎЧЭНКІ

Дзяржкамтэлерадыё Украіны падрыхтаваўся да 200-годдзя з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі. Да гэтай даты ўкраінская шаўчэнкіяна папоўніцца многімі новымі выданнямі, якія запланаваныя ў межах праграмы «Украінская кніга». Акрамя замоўленых Дзяржкамтэлерадыё Украіны, выйдзе «Шевченківська енциклопедія» ў 6-ці тамах, якая змяшчае каля 6500 артыкулаў пра жыццё, творчасць, асобу Вялікага Кабзара, яго атачэнне ды тагачасную эпоху.

ПОМНІК СЯРГЕЮ МІХАЛКОВУ

Манумент савецкаму пісьменніку Сяргею Міхалкову да Дня горада з'явіцца ў Арбацкім раёне ў цэнтры Масквы. Побач плануецца стварыць дзіцячую пляцоўку, якую ўпрыгожыць скульптурная кампазіцыя з выявамі герояў кніг С. Міхалкова. Рашэнне пра ўсталёўку помніка і пра стварэнне сквера, які назавуць імем вядомага пісьменніка, было прынята ў сярэдзіне сакавіка 2013 года.

▾ ПРЭМІІ

ПЯЦЬ НАМІНАНТАЎ НА НОБЕЛЕЎКУ



Нобелеўскі камітэт вызначыўся з папярэднім «кароткім спісам» прэтэндэнтаў на Нобелеўскую прэмію па літаратуры за 2013 год. Пяцёра кандыдатаў ужо адабраныя, паведамляецца на «нобелеўскай» фэйсбук-старонцы са спасылкай на сакратара Шведскай акадэміі.

Што да канчатковага шорт-ліста, рашэнне па ім было прынята 30 траўня 2013 г.

Па традыцыі імёны прэтэндэнтаў на «Нобелеўку» па літаратуры не агучваюцца, але ў блогу Петэра Энглунда (сакратара Шведскай акадэміі) магчымыя постаці ўжо абмяркоўваліся. Было агучана, што лонг-ліст 2013 г. налічваў не 195, як летась, а 210 імёнаў.

Хто стане нобелеўскім лаўрэатам у галіне літаратуры ў 2013-м г., будзе абвешчана ў лістападзе. Нагадаем, у мінулым 2012-м г. Нобелеўскую прэмію атрымаў кітайскі пісьменнік Мо Янь.

ПРЭМІЯ ІМЯ КАФКІ

На паседжанні міжнароднага журы экспертаў Літаратурнай прэміі Франца Кафкі было абвешчана імя лаўрэата. Сёлета прэстыжнай узнагародай адзначаны Амос Оз, ізраільскі пісьменнік расійскага паходжання. Празаік быў прызнаны лепшым з 28 кандыдатаў, якія займаюць высокае становішча ў сучаснай літаратуры. Узнагароду — бронзавую статуэтку Франца Кафкі, створаную скульптарам Яраславам Ронам, — уручаць у канцы кастрычніка на ўрачыстай цырымоніі, якая, па традыцыі, адбудзецца ў Старой Ратушы ў Празе.

Амос Оз нарадзіўся ў сям'і выхадцаў з Расіі ў 1939 годзе ў Іерусаліме. Сярод найбольш вядомых яго твораў — раманы «Мой Міхаэль», «Спазнаць жанчыну», «Трэці стан», зборнік эсэ «Маўчанне нябёсаў».

Штогадовая прэмія Франца Кафкі ўручаецца з 2001 года. У ліку яе лаўрэатаў — першы прэзідэнт Чэхіі, пісьменнік-дысідэнт Вацлаў Гавэл, японскі пісьменнік і перакладчык Харукі Муракамі, амерыканскі раманіст Піліп Рот, уладальніца Нобелеўскай прэміі 2004 года па літаратуры Эльфрыда Элінэк.

РЭВІЗІЯ АРХІВАЎ ПЕРАДЗЕЛКІНА

Міністэрства культуры Расіі вырашыла правесці рэвізію архіваў, якія захоўваюцца на дачах сваякоў пісьменнікаў у Перадзелкіна. Праверка павінна завяршыцца да 1 верасня.

15 траўня міністр культуры Расіі Уладзімір Медзінскі правёў пасяджэнне, на якім абмяркоўваліся пытанні захоўвання літаратурна-гістарычнай спадчыны, якая знаходзіцца на тэрыторыі пісьменніцкага мястэчка, і забеспячэнні яго бяспекі.

Перад міністэрствам пастаўленая задача захаваць чатыры музеі, якія працуюць у Перадзелкіна, а таксама «разабрацца з архівамі». Распрацоўваецца праект па іх перадачы Дзяржаўнаму літаратурнаму музею ці Дзяржаўнаму архіву РФ.

Рэвізію архіваў плануецца правесці ў рамках закона, па дамоўленасці са спадчыннікамі, каб зразумець каштоўнасць архіваў для даследавання творчасці пісьменнікаў. Пытанне аб перадачы архіўных дакументаў і матэрыялаў будзе вырашацца індывідуальна, шляхам перамоў.

Мінкульт заклапаціўся станам Перадзелкіна пасля таго, як у мястэчку адбыліся некалькі значных пажараў. У 2012 г. згарэла дача Анатоля Рыбакова, у выніку чаго быў знішчаны ўвесь архіў. У ноч на 9 траўня 2013 г. згарэла дача пісьменніка, літаратуразнаўцы, гісторыка літаратуры, доктара філалагічных навук Алега Міхайлава. Згарэў дом Міхайлава, яго бібліятэка, перапіска з пісьменнікам Барысам Зайцавым і іншыя матэрыялы.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў Newsru.ua, novostiliteratury.ru, Associated Press, РИА Новости, ЗІК.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by